АПЛАТУ «КАМУНАЛКІ» ПЕРАГЛЕДЗЯЦЬ 2

ЗА ШТО ДАПЛАЦЯЦЬ ПЕДАГОГАМ 3

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

1 ЛЮТАГА 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 21 (28888)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Леанід ЗАЯЦ, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання:

«Экспарт беларускай сельгаспрадукцыі за 2018 год перасягнуў мяжу ў пяць мільярдаў долараў. На гонар сельгасвытворцам, мы забяспечылі багаты ўнутраны спажывецкі стол, а таксама рэалізацыю сваёй прадукцыі, размяняўшы шосты мільярд па экспарце. На гэтую пяцігодку пастаўлены амбіцыйныя задачы: Беларусь плануе выйсці на валавы ўнутраны прадукт у памеры, не меншым за 100 мільярдаў долараў, і сельскагаспадарчай галіне неабходна практычна ў 1,5 раза павялічыць аб'ёмы таварнай прадукцыі, каб забяспечыць фінансавыя патрэбнасці і падняць дабрабыт працаўнікоў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці. Для гэтага ўжо сёлета трэба павялічыць вытворчасць прадукцыі не менш як на 5 %, а ў 2020 годзе — не менш як на 3 %».

Асцярожна: тонкі лёд!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Старшы матрос дзяржаўнага выратавальнага паста Чачэрска і старшыня раённай арганізацыі АСВОДа Уладзімір ВЕЛІГАЕЎ нясе дзяжурства на беразе гарадскога возера нават зімою — у гэты час ён адсочвае паводзіны людзей на лёдзе, у тым ліку і рыбакоў. Калі ўмовы надвор'я (як, напрыклад, сёння) не спрыяюць выхаду на лёд, ратавальнік устанаўлівае папераджальныя шыльдачкі, робіць вусныя заўвагі парушальнікам, вядзе растлумачальную работу. Уладзімір Паўлавіч амаль дваццаць гадоў працягвае штодзённую варту.

Разумныя грошы

А КРЭДЫТ ВАМ МОГУЦЬ І НЕ ДАЦЬ

Памятку крэдытаатрымальніку ад Нацбанка павінен пачытаць кожны «фінансіст»

З якой бы прычыны вы ні вырашылі скарыстацца крэдытам, трэба выразна ўсведамляць: яго неабходна вяртаць строга ў адпаведнасці з умовамі крэдытнага дагавора, а таксама выплаціць банку працэнты за карыстанне пазычанымі грашыма. Перад гэтым сур'ёзным крокам варта рэальна ацаніць стабільнасць сваіх даходаў і магчымасць своечасова ажыццяўляць плацяжы па крэдытным дагаворы. Добра б яшчэ прааналізаваць магчымыя фінансавыя рызыкі...

Летась зацверджаны новыя правілы выдачы крэдытаў, акрамя таго былі ўнесены змены ў Банкаўскі кодэкс. У сувязі з гэтым Нацыянальным банкам была падрыхтавана памятка крэдытаатрымальніку. Мы падрыхтавалі агляд асноўных нюансаў гэтага дакумента.

Не спяшайцеся і вывучыце пытанне

Калі вы прынялі рашэнне ўзяць крэдыт, абярыце найлепшую прапанову. Банкамі краіны прапануецца досыць вялікі выбар крэдытных прадуктаў на розных умовах. З умовамі выдачы крэдытаў можна азнаёміцца на афіцыйных сайтах банкаў (спасылкі размешчаны на сайце Нацыянальнага банка www.nbrb.by ў раздзеле «Банкаўская сістэма»). І яшчэ. Звяртайцеся да супрацоўнікаў банка па тлумачэнне незразумелых умоў.

Перад падпісаннем крэдытнага дагавора неабходна старанна вывучыць яго. Для гэтага вазьміце тыпавую форму крэдытнага дагавора дадому і ўважліва вывучыце ўмовы, якія датычацца адказнасці.

СТАР. 3

Спецыяльны рэпартаж

«Раней ад прышчэпак адмаўляліся»

Як працуе ветслужба ў Стаўбцоўскім раёне, дзе цяпер каранцін

«За вамі воўк, не баіцеся?» — усміхаецца мінак, ківаючы на вялікага чорнага сабаку, што бяжыць за намі па чыгуначным пераходзе. Ведаем, што жарт, але, калі сабака мінае нас, не звярнуўшы ніякай увагі, уздыхаем з палёгкай. У Стоўбцах і вёсцы Слабада, дзе ў мінулыя выхадныя воўк накінуўся на чатырох чалавек, на два месяцы ўвялі каранцін. Жывёл нельга вывозіць у іншыя раёны, на выстаўкі, а ветстанцыя праводзіць актыўную вакцынацыю — ахапілі таксама суседнія вёскі Задвор'е і Акінчыцы. «Звязда» паглядзела, што адбываецца ў рэгіёне ў гэтыя дні.

СТАР. 4

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

«Пасля здарэння з воўкам на прышчэпку адразу пагаджаюцца», — кажа вядучы ветэрынарны ўрач-эпізаатолаг Генадзь МАРКОЎСКІ.

КАРАТКА

• Магіляўчанам прэзентавалі «Букініст» ад «Белкнігі». Буйнейшы ў Беларусі рэалізатар кніжнай прадукцыі гучна заявіў аб сваім вяртанні ў Магілёў.

• **Чэмпіянат сіл спецыяльных аперацый па армейскім рукапашным баі прайшоў у Віцебску.**

• Даследчая група HTF MI ўключыла рэзідэнта Парка высокіх тэхналогій — беларускую кампанію Synesis у спіс лідараў рынку сістэм інтэлектуальнага відэаназірання і аналітыкі.

ISSN 1990 - 763X

У ІНТАРЭСАХ КРАІНЫ

Інфармацыйную бяспеку і працу найбуйнейшых СМІ абмеркавалі на нарадзе ў Прэзідэнта

У пачатку сустрэчы з прадстаўнікамі Адміністрацыі Прэзідэнта, кіраўнікамі СМІ і экспертамі беларускі лідар адзначыў, што хацеў бы разгледзець шэраг пытанняў, якія датычацца перш за ўсё інфармацыйнай бяспекі нашай дзяржавы. «Тут у нас прыстойны кавалак работы. Не сказаў бы, што мы атрымалі поспех у гэтым плане. Пытанне вельмі сур'ёзнае», — падкрэсліў ён.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што інфармацыйная бяспека — гэта адзін з важных кірункаў бяспекі краіны ў цэлым, а сёння яна выйшла на пярэдні план у функцыянаванні любой дзяржавы.

«Скажам шчыра (не дай бог, вядома): любая халодная ці тым больш гарачая вайна ніколі не пачынаецца без інфармацыйнага ціску і проціборства. Таму ў больш маштабным, сур'ёзным ключы мы гэтую праблему ўсебакова прааналізуем на найбліжэйшым пасяджэнні Савета Бяспекі Беларусі. Гэта пытанне нумар адзін, якое мы разгледзім», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым Прэзідэнт заявіў, што прапагандаваць нам асабліва не трэба, а вось весці барацьбу за свае прынцыпы, падымаць імідж нашай краіны — неабходна. Таксама трэба ўмець супрацьстаяць, асабліва ў СМІ, тым нападам, якія робяцца на Беларусь.

«І нам трэба ў гэтым плане вызначыцца. Менавіта інфармацыйная бяспека ў кантэксце СМІ, асабліва інтэрнэту, — гэта асноўнае пытанне», — дадаў ён.

Таксама беларускі лідар адзначыў слабую эфектыўнасць, асабліва ў процібор стве з рознага кшталту каналамі, старонкамі і сайтамі ў інтэрнэце. На яго думку, спецыялістаў, прафесіяналаў у нас хоць адбаўляй — проста не было адпаведнай арганізацыі.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што наспела пытанне стварэння арганізацыі, якая будзе ацэньваць рэйтынгі СМІ — аднак яе трэба зрабіць такой, каб ёй давяралі людзі і, перш за ўсё, СМІ, якія будуць падлягаць гэтай ацэнцы.

Іншая тэма нарады — рэкламны рынак Беларусі. «Трэба паглядзець, як яго можна абараніць, калі ў гэтым ёсць пэўная патрэба. Словам, у якім кірунку, у якім кантэксце мы будзем дзейнічаць у плане рэкламы ў СМІ, каб гэтыя грошы засталіся менавіта ў нас у краіне, у вас — вядучых сродкаў масавай інфармацыі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Па выніках нарады прэс-сакратар Прэзідэнта Наталля Эйсмант паведаміла, што ў найбліжэйшыя дні на разгляд Аляксандра Лукашэнкі будзе ўнесена пэўная прапанова аб стварэнні ў краіне новай сістэмы медыявымярэнняў. Дарэчы, на сустрэчы былі агучаны розныя варыянты арганізацыі працэсу: ад прыцягнення замежнай міжнародна прызнанай даследчай кампаніі да арганізацыі ўласнага дзяржаўнага вымяральніка. Пры гэтым Прэзідэнт сфармуляваў галоўны крытэрый — сістэма павінна працаваць у інтарэсах краіны.

Паводле БелТА.

Лідары Беларусі і Расіі дамовіліся аб чарговай сустрэчы

Адбылося гэта падчас тэлефоннай размовы Аляксандра Лукашэнкі і Уладзіміра Пуціна. Якім чынам рэалізуюцца дамоўленасці мінулых перагавораў — такая тэма будзе ў фокусе ўвагі на сустрэчы, якая адбудзецца ў хуткім часе.

Акрамя таго прэзідэнты абмеркавалі стан двухбаковых адносін, узаемадзеянне ў гандлёва-эканамічнай сферы, звярнулі асаблівую ўвагу на наданне эфектыўнасці сфарміраванай двухбаковай групе.

Аб тым, што інфармацыйная бяспека таксама стала адной з тэм размовы, пасля на нарадзе з кіраўнікамі СМІ расказаў Аляксандр Лукашэнка. «У плане маючай адбыцца сустрэчы вызначыліся, што мы сур'ёзна абмяркуем гэтую праблему ў кантэксце нашых двухбаковых адносін, дзе мы можам папрацаваць разам», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Паводле БелТА.

РАЗМОВЫ З ТОЛКАМ

Прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 2 лютага ў Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах. На званкі з 9.00 да 12.00 адкажуць:

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Андрэй Анатолевіч КЛЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8 021 222 22 22;

першы намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Генадзь Міхайлавіч САЛАВЕЙ. Тэл. 8 023 233 12 37;

кіраўнік спраў ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Ігар Андрэевіч ПАПОЎ. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Руслан Віктаравіч ПАРХАМОВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

старшыня МІНСКАГА аблвыканкама Анатоль Міхайлавіч ІСАЧАНКА. Тэл. 8 017 500 41 60;

першы намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Фёдар Віктаравіч РЫМАШЭЎСКІ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Актуальна

ЗВЯРТАЙЦЕСЯ Ў КАМІСІЮ

Што рабіць, калі «камуналку» памылкова налічылі па тарыфе для незанятых

Тым, каго памылкова занясуць у базу незанятых і налічаць жыроўку «па поўнай», трэба будзе звярнуцца ў камісію і пацвердзіць сваю занятасць. Пасля гэтага аплату «камуналкі» перагледзяць. Пра гэта расказаў першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Андрэй ЛАБОВІЧ падчас анлайн-канферэнцыі на сайце ведамства. Ён дадаў, што новыя паслугі, за якія не занятым у эканоміцы давядзецца плаціць па стапрацэнтным тарыфе, уводзіць не плануецца.

Першы намеснік міністра звярнуў увагу яшчэ на пару момантаў дзеяння дэкрэта. Так, тым, хто працуе за мяжой, трэба даслаць у камісіі дакументы, якія гэта пацвярджаюць. Прычым паперы павінны быць перакладзены на рускую ці беларускую мову і афіцыйна завераны арганізацыяй, якая надзелена правам сведчыць правільнасць перакладу ў адпаведнасці з заканадаўствам. Калі ў дакументах пазначаны іх перыяд дзеяння, то да яго заканчэння грамадзян не будуць уключаць у спіс незанятых. Калі ж перыяд не прапісаны, то максімальны тэрмін, на які не ўнясуць у базу, — адзін год.

Сёлета пералік тэрыторый з напружанай сітуацыяй на рынку працы павялічыўся. Туды ўвайшлі 52 раёны і горад Бабруйск. Апошні аказаўся ў ліку праблемных з дзвюх прычын: высокі працэнт вымушанай няпоўнай занятасці і нізкі тэмп росту колькасці занятых у эканоміцы. Хоць у іншых гарадах абласнога падпарадкавання, што былі ў леташнім спісе тэрыторый з напружанай сітуацыяй, справы палепшыліся.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

Парламенцкі дзённік

ПАВЫШАЮЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ

Уладзімір Андрэйчанка запрасіў Арменію да ўдзелу ў канферэнцыі Групы падтрымкі Шоўкавага шляху Парламенцкай асамблеі АБСЕ

Канферэнцыя Групы падтрымкі Шоўкавага шляху Парламенцкай асамблеі АБСЕ, прыняць удзел у якой запрасілі армянскі бок, пройдзе ў маі ў Мінску. Больш за тыдзень таму Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Арменіі ў Беларусі Армен Гевандзян уручаў даверчы ліст Прэзідэнту Беларусі, а ўжо ўчора дыпламата віталі ў Палаце прадстаўнікоў. Такая актыўнасць і запал да працы не толькі паказчык узаемадзеяння краін, але і знак асаблівых сувязяў дзвюх парламентаў.

— Арменія з'яўляецца для нас надзейным партнёрам. У нас шматпланавае развіццё і супрацоўніцтва ў разнастайных кірунках — гандлёва-эканамічным і культурным, міжпарламенцкім. І канешне, мы зацікаўлены ў тым, каб гэта супрацоўніцтва ўзмацняць, развіваць. Сур'ёзную ролю ў гэтым адводзім нашаму парламенцкаму складніку, — сказаў **Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў.**

Дзеля гэтага створана міжпарламенцкая камісія, якая мае асобы статус. Усяго дзейнічаюць толькі дзве такія камісіі (яшчэ адна з Украінай), астатнія маюць узровень рабочых груп.

— У нашых адносінах ёсць вялікі незадзейнічаны патэнцыял. І сваю задачу ў якасці пасла бачу ў тым, каб садзейнічаць раскрыццю гэтага патэнцыялу і дапамагаць нашым органам выканаўчай улады, закандаўчай улады, — адзначыў **пасол Армен ГЕВАНДЗЯН.**

Асаблівы акцэнт, па словах Уладзіміра Андрэйчанкі, трэба зрабіць на рэгіянальнае ўзаемадзеянне, пабрацімскія сувязі (зараз разглядаецца пагадненне аб пабрацімстве паміж Мінскам і Ерэванам), кааперацыю.

— Мы гатовы прыняць удзел у абнаўленні парку пасажырскай тэхнікі ў вашай краіне. Гатовы ўдзельнічаць у вашай праграме абнаўлення ліфтавай гаспадаркі, — заверыў партнёраў спікер Палаты прадстаўнікоў.

Дамоўленасці аб стварэнні сумеснай вытворчасці чакаюць ад будучага візіту прадстаўнікоў завода «Магілёўліфтмаш» у Арменію.

Супрацоўніцтва рэалізуецца не толькі на двухбаковым узроўні. Плён дае ўзаемадзеянне ў рамках міжнародных арганізацый — ЕАЭС і АДКБ. Па словах Армена Гевандзяна, прасоўванне інтэграцыі — важны кірунак супрацоўніцтва. Рухацца трэба ў рамках пастулатаў дагавораў, якія дапамогуць забяспечыць усю гаму ўзаемадзеяння і стварыць спрыяльныя ўмовы для ўсіх удзельнікаў саюза.

Марыя ДАДАЛКА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Кангрэсе ЗША мяркуюць абмежаваць права Трампа наносіць ядзерны ўдар

Амерыканскія кангрэсмены маюць намер абмежаваць права прэзідэнта ЗША на ўжыванне ядзернай зброі — два адпаведныя законапраекты ўнеслі сенатары не толькі ад дэмакратаў, але і ад рэспубліканцаў. Першая прапанова паступіла ад сенатара і прэтэндэнта на вылучэнне ў прэзідэнты ад Дэмакратычнай партыі Элізабэт Уорэн і кіраўніка камітэта Палаты прадстаўнікоў па ўзброеных сілах Адама Сміта. Законапраектам прапануецца зрабіць адмову ад прымянення ядзернай зброі афіцыйнай палітыкай ЗША, паведамляе РІА Навіны са спасылкай на прэс-службу суаўтараў законапраектаў. «Наша цяперашняя палітыка небяспечная, а законапраект знізіць шанцы на пралікі ў ядзернай сферы», — адзначаецца ў адпаведнай заяве. Другое абмежаванне прапанавалі ўвесці сенатар-рэспубліканец Тэд Лье і яго калега-дэмакрат Эд Маркі, якія прадставілі Кангрэсу дакумент, што забараняе Трампу наносіць ядзерны ўдар без дазволу Кангрэса. Зараз прэзідэнт ЗША мае магчымасць прыняць рашэнне аб ядзерным удары самастойна, атрымаўшы ад ваенных інфармацыю пра пагрозу. Пры гэтым ніякай «чырвонай кнопкі» ў прэзідэнта няма — ён аддае каманду ўжыць ядзерную зброю ваеннаслужачаму з дапамогай спецыяльных кодаў. Ваенны з сістэмай кіравання — так званым ядзерным чамаданчыкам — неадступна знаходзіцца пры прэзідэнце. Пры гэтым застаецца незразумелым, як праводзіць кансультацыі з Кангрэсам ва ўмовах, калі рашэнне аб прымяненні ядзернай зброі павінна быць прынята неадкладна.

Да 2035 года Джакарта стане самым населеным горадам у свеце

Самым населеным горадам свету стане сталіца Інданезіі, вынікае з прагнозу навукова-даследчага інстытута Oxford Economics. Паводле даных даследавання, праз 16 гадоў насельніцтва Джакарты дасягне 38 мільёнаў чалавек. На другім месцы ў спісе самых населеных гарадоў да 2035-га — Токіа з прагназуемым насельніцтвам у 37,8 мільёна чалавек. Замыкае тройку найбуйнейшых мегаполісаў свету Чунцын, які размешчаны ў цэнтральнай частцы Кітая. Паводле прагнозу, у 2035-м там будуць пражываць 32,2 мільёна чалавек. У топ-10 гарадоў з самым вялікім насельніцтвам праз 16 гадоў таксама фігуруе Дака (31,2 млн чалавек), Шанхай (25,3 млн), Карачы (24,8 млн), Кіншаса (24,7 млн), Лагас (24,2 млн), Мехіка (23,5 млн) і Мумбаі (23,1 млн). Даследчыкі таксама склалі прагноз адносна эканамічнага росту ў перыяд з 2019-га да 2035-га. Так, згодна з прадстаўленай інфармацыяй, самыя высокія тэмпы эканамічнага росту будуць зафіксаваныя ў індыйскіх гарадах. На першым радку гэтага рэйтынга размешчаны горад Сурат, за ім ідуць Агра і Бангалор. Між тым па даных прагнозу, Нью-Ёрк да 2035 года будзе горадам з самай магутнай эканомікай. На другім і трэцім радках размесцяцца Токіа і Лос-Анджэлес.

У Японіі на інтэрнэт-аўкцыёне прадавалі ўран

Да такой высновы прыйшло Такійскае паліцэйскае ўпраўленне пасля года расследавання. У студзені мінулага года спецыяліст упраўлення па кантролі над атамнай энергіяй звярнуў увагу на тое, што на адным з інтэрнэт-аўкцыёнаў прадаецца ўран, паведаміла тэлекампанія NHK. Гаворка ішла аб так званым абедненым уране — пабочным прадукце ўзбагачэння ўрану з адносна нізкай радыеактыўнасцю. У выніку расследавання паліцыі ўдалося выйсці на прадаўца і пакупніка. Прадавец ужо заявіў, што сам набыў уран «на адным з замежных сайтаў». Паліцыя працягвае расследаванне. Як вядома, продаж радыеактыўных рэчываў без адпаведнага дазволу забаронены ў Японіі.

Падрабязнасці

За арганізацыю харчавання і падвоз навучэнцаў педагогаў заахвоцяць

Пастановай Міністэрства адукацыі зацверджана Інструкцыя аб памерах, парадку і ўмовах устанаўлення надбавак педагагічным работнікам бюджэтных арганізацый.

Як ужо паведамлялася раней, з 1 студзеня 2019 года педагагічным работнікам устанаўліваюцца надбаўкі, якія ўлічваюць галіновыя асаблівасці педагагічнай дзейнасці.

Пастанова змяшчае пералік відаў работ (функцый), за выкананне якіх устанаўліваюцца надбаўкі: у яго ўвайшлі сістэмная работа па арганізацыі харчавання навучэнцаў, іх аздараўлення, у тым ліку ў канікулярны перыяд, работа з адоранымі і таленавітымі навучэнцамі, удзел у дзейнасці вучэбна-метадычных аб'яднанняў і іншыя.

Згаданыя надбаўкі ўстанаўліваюцца ў працэнтах ад тарыфнай стаўкі першага разраду. Максімальны памер надбаўкі можа скласці 142 рублі.

Напрыклад, памер надбаўкі за сістэмную работу па абароне правоў і законных інтарэсаў дзяцей з праблемных сем'яў, дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без бацькоўскай апекі, можа дасягаць 200 %. За суправаджэнне навучэнцаў пры арганізацыі іх падвозу ва ўстановы адукацыі памер надбаўкі — да 150 % ад тарыфнай стаўкі першага разраду, за работу з адоранымі і таленавітымі навучэнцамі (падрыхтоўку іх да алімпіяд, конкурсаў і г. д.) — да 300 %. За ўдзел у дзейнасці вучэбна-метадычных аб'яднанняў — да 300 %. За арганізацыю ўдзелу навучэнцаў у рэгіянальных, рэспубліканскіх грамадска значных мерапрыемствах і суправаджэнне іх на гэтыя мерапрыемствы — да 150 %. За кансультаванне інавацыйных праектаў, што рэалізуецца на базе ўстановы адукацыі, — да 200 %. За суправаджэнне навучэнцаў на адукацыйныя мерапрыемствы, якое доўжыцца больш як суткі, — да 250 %.

Памер надбаўкі педагагічным работнікам з прафесарска-выкладчыцкага складу за кураторства вучэбнай групы можа дасягаць 300 % ад тарыфнай стаўкі першага разраду, за распрацоўку вучэбна-праграмнай дакументацыі на замежнай мове — 400 %, за арганізацыю навукова-даследчай работы навучэнцаў — 200 %, за работу з замежнымі навучэнцамі — 200 %, за работу па ўзаемадзеянні з арганізацыямі — заказчыкамі кадраў — 200 %.

Надбаўкі могуць устанаўлівацца па адной ці некалькіх падставах. Пры ўстанаўленні надбавак па некалькіх падставах яны падсумоўваюцца. Канкрэтныя памеры надбавак устанаўліваюцца загадам кіраўніка бюджэтнай арганізацыі па ўзгадненні з прафсаюзам на падставе палажэння аб надбаўках педагагічным работнікам, якое зацвярджаецца кіраўніком бюджэтнай арганізацыі.

У Міністэрстве адукацыі лічаць, што гэта мера дасць магчымасць павысіць заработную плату педагогам, а таксама забяспечыць дыферэнцыраваны падыход да аплаты працы педагагічных работнікаў з улікам аб'ёму, складанасці і выніковасці іх працы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Надвор'е

Люты стартуе адлігай

Тэмпературны фон будзе ў асноўным на 5—9 градусаў вышэй за кліматычную норму

У выхадныя атмасферныя франты, якія ссоўваюцца з поўдня Еўропы, прынясуць новую порцыю цяпла і вільгаці.

Ападкі будуць выпадаць у асноўным у выглядзе дажджу, што ў спалучэнні са станоўчымі тэмпературамі прывядзе да раставання снегу, і ў паўднёва-заходніх раёнах краіны снег растане, а на астатняй тэрыторыі значна паменшыцца, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У першы дзень лютага чакаецца на большай частцы тэрыторыі краіны дождж і мокры снег, у асобных раёнах наліпанне мокрага снегу. Месцамі чакаецца туман, галалёд, дарогі будуць слізкімі. Тэмпература паветра будзе ў межах ад мінус 2 градусаў да 3 цяпла. У выхадныя дні надвор'е ў краіне будуць вызначаць атмасферныя франты і цёплыя паветраныя масы міжземнаморскага паходжання.

Кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу чакаюцца і ў суботу на большай частцы тэрыторыі краіны. Месцамі туман, уначы і раніцай на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе ад 3 марозу да 2 цяпла, удзень — ад нуля да плюс 6 градусаў. У нядзелю часам чакаецца дождж. Месцамі туман, уначы на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература ўначы чакаецца ад мінус 1 градуса да 4 цяпла, удзень — ад нуля да плюс 7 градусаў.

У панядзелак і аўторак таксама будзе анамальна цёплае надвор'е. У першы дзень тыдня пад уплывам франтальнага раздзелу месцамі, пераважна па паўночным захадзе краіны, пройдуць дажджы. У асобных раёнах туман, уначы і раніцай слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Уначы будзе ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла, удзень чакаецца 1—6 вышэй за нуль.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у сярэдзіне наступнага тыдня з паўночна-заходнімі патокамі ў атмасферы на тэрыторыю краіны пачне паступаць больш халодная паветраная маса скандынаўскага паходжання. Пахаладае.

Сяргей КУРКАЧ.

На слыху

Чарговыя ахвяры вадкасці-забойцы...

У Мсціслаўскім раёне ад атручэння невядомай вадкасцю памерлі двое мужчын, яшчэ двое знаходзяцца ў бальніцы.

Чацвярых мужчын у коме невыразнай этыялогіі ў розны час сутак яшчэ 20 студзеня брыгада хуткай дапамогі даставіла ў бальніцу Мсціслава. Пазней высветлілася, што напярэдадні адзін з іх знайшоў неўстаноўленую вадкасць у пяцілітровай каністры, якую на наступны дзень ужыў сумесна з трыма знаёмымі. 21 студзеня двое мужчын памерлі. Згодна з папярэднім заключэннем эксперта, смерць наступіла ў выніку вострага атручэння неўстаноўленым рэчывам.

Нагадаем, нядаўна ад атручэння светла-блакітнай вадкасцю таксама з пяцілітровай каністры памерлі двое мужчын у Барысаўскім раёне. Напярэдадні муж з жонкай і іх прыяцель ужывалі яе ў адной з вёсак. Жанчына знаходзіцца ў рэанімацыі з прыкметамі атручэння метылавым спіртам.

«Міністравалі» школы ў Гомелі і Гродне

Больш за сто чалавек былі эвакуяваны са школы ў Гомелі з-за пагрозы мініравання.

У аператыўна-дзяжурную службу Чыгуначнага РАУС паступіла інфармацыя ад адміністрацыі сярэдняй школы № 55: на сайце навучальнай установы невядомы пакінуў паведамленне з пагрозай. У тэксце гаварылася, што ў школе закладзена выбуховае ўстройства. Яго прывядуць у дзеянне ў выпадку атрымання адмоўных адзнак па выніках кантрольнай работы. Па інфармацыі афіцыйнага прадстаўніка УУС Гомельскага аблвыканкама Віталя Прыстромава, са школы былі эвакуяваны 112 чалавек. У выніку праверкі з удзелам службовага сабакі выбуховыя ўстройствы не былі знойдзены.

У гэты ж дзень паступіла лжывае паведамленне і аб мініраванні навучальнай установы ў Гродне. Як устанавілі супрацоўнікі міліцыі, такую інфармацыю праз сацыяльныя сеткі распаўсюдзіў навучэнец адной з навучальных установ абласнога цэнтра.

Навучэнцы і педагагічны калектыў былі аператыўна эвакуяваны.

Па інфармацыі афіцыйнага прадстаўніка УУС Гродзенскага аблвыканкама Ігара Белазёрава, выбуховых устройстваў не знойдзена.

Гродзенскі міжраённы аддзел Следчага камітэта завёў крымінальную справу па факце заведама лжывага паведамлення аб небяспецы ў адносінах да 16-гадовага жыхара Гродна.

Сяргей РАСОЛЬКА.

А КРЭДЫТ ВАМ МОГУЦЬ І НЕ ДАЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ваша права на атрыманне своечасовай, неабходнай і дакладнай інфармацыі замацавана заканадаўча. Банк да заключэння крэдытнага дагавора абавязаны падаць вам у пісьмовым выглядзе пад подпіс уніфікаваную інфармацыю аб умовах крэдытавання.

Дарэчы, інфармацыя аб умовах крэдытавання даецца банкамі бясплатна, а подпіс заяўнікам інфармацыі аб умовах крэдытавання не з'яўляецца заключэннем крэдытнага дагавора і не азначае ўзнікнення якіх-небудзь абавязацельстваў у кліента.

Пагасіць крэдыт можна заўсёды

Вяртанне крэдыту і аплата працэнтаў за карыстанне ім могуць ажыццяўляцца рознымі спосабамі. Працэнты за карыстанне крэдытам вызначаюцца зыходзячы з фактычнага астатку запазычанасці за фактычны час карыстання ім. Парадак разліку плацяжоў варта вывучыць да заключэння крэдытнага дагавора.

А цяпер новае. Крэдыт на спажывецкія патрэбы кліент мае права вярнуць датэрмінова, без апавяшчэння банка. Пры гэтым неабходна выплаціць працэнты за фактычны тэрмін карыстання крэдытам.

Адмова ў выдачы крэдыту

Пры выдачы крэдыту ацэнка крэдытаздольнасці заяўніка вядзецца на падставе шматфактарнага аналізу. Спецыялістамі ацэньваецца заяўлены кліентам узровень атрыманых даходаў, магчымасць своечасова рабіць рэгулярныя плацяжы ў пагашэнне крэдытаў і працэнтаў за карыстанне ім у адпаведнасці з умовамі крэдытнага дагавора. Акрамя таго, вывучаецца ваша крэдытная гісторыя.

Пры выдачы крэдыту на спажывецкія патрэбы банк павінен выкарыстоўваць паказчык пазыковай нагрузкі (ППН). Названы паказчык — суадносна крэдытных выплат да даходу ў месяц — не павінен перавышаць 40 працэнтаў.

Пры прадастаўленні крэдыту на фінансаванне нерухомасці банк павінен выкарыстоўваць у тым ліку паказчык забяспечанасці крэдыту (ПЗК). Згаданы паказчык разлічваецца як працэнтныя суадносіны сумы крэдыту да кошту аб'екта нерухомасці, які прымаецца ў заклад у якасці забеспячэння, і (або) сумы іншага забеспячэння ў адпаведнасці з дагаворам. Названы паказчык не павінен перавышаць 90 працэнтаў.

Перавышэнне ўстаноўленых паказчыкаў можа быць прычынай адмовы ў выдачы крэдыту. І яшчэ. Банкі маюць права адмовіцца ад заключэння дагавора пры наяўнасці сведчанняў аб тым, што выдадзеная чалавеку сума крэдыту не будзе вернутая ў тэрмін.

У выпадку адмовы ад заключэння крэдытнага дагавора банкам рэкамендавана даступна, аргументавана і кампетэнтна растлумачыць заяўнікам прычыны прыняцця адмоўнага рашэння аб выдачы крэдыту. Як правіла, раней банкі адмаўлялі без тлумачэння прычын.

Нацыянальны банк папярэджвае

Заканадаўствам вызначаны існуючыя ўмовы крэдытнага дагавора, якія абавязкова павінны ў ім прысутнічаць. Фінансавы рэгулятар нагадвае, якія менавіта. Гэта:

— аб суме крэдыту;

— аб тэрміне і парадку выдачы і вяртання крэдыту;

— аб памеры працэнтаў за карыстанне крэдытам і парадку іх аплаты;

— аб адказнасці крэдытора і крэдытаатрымальніка за невыкананне (неналежнае выкананне) імі абавязацельстваў;

— іншыя ўмовы, адносна якіх па заяве аднаго з бакоў павінна быць дасягнута згода.

Пры вызначэнні ў крэдытным дагаворы парадку выдачы і вяртання крэдыту банк абавязаны прапанаваць адзін са спосабаў выдачы і вяртання крэдыту, якія ажыццяўляюцца бясплатна.

Каму павінен і колькі?

Устаноўлена забарона на спагнанне банкамі якіх-небудзь дадатковых плацяжоў (камісійных і іншых узнагароджанняў) за карыстанне крэдытам. Гэта значыць, што выдаткі, звязаныя з выдачай і вяртаннем крэдыту, банк павінен уключаць у працэнтную стаўку (напрыклад, выдаткі банка па разглядзе дакументаў, суправаджэнні крэдыту, выпуску і абслугоўванні дадатковай карткі і іншыя).

Зараз кліент банка мае права атрымліваць па запыце інфармацыю аб сваёй запазычанасці па крэдытным дагаворы па меншай меры адзін раз у месяц бясплатна. Такой інфармацыяй з'яўляюцца звесткі аб суме запазычанасці па крэдыце ў частцы асноўнай сумы доўгу, працэнтах за карыстанне ім, а таксама ў частцы пратэрмінаванай запазычанасці.

Дык вось, пры ўзнікненні пратэрмінаванай запазычанасці па крэдытным дагаворы банк абавязаны інфармаваць крэдытаатрымальніка ў тэрмін не пазней за 30 дзён са дня яе ўтварэння. І гэта банкі павінны рабіць бясплатна.

Кожны чалавек павінен улічваць, што Нацбанк не мае паўнамоцтваў на ўмяшанне ў дагаворныя адносіны паміж фінансавымі інстытутамі і кліентамі.

Таму важна, каб самі крэдытаатрымальнікі фінансава кампетэнтна ставіліся да заключэння крэдытнага дагавора з банкам. Трэба памятаць, што, падпісаўшы крэдытны дагавор, вы згаджаецеся з усімі яго ўмовамі і прымаеце на сябе абавязацельства па іх выкананні.

Сяргей КУРКАЧ.

«Раней ад прышчэпак адмаўляліся»

Бясплатная вакцына і 5000 шпрыцаў

Вёска Задвор'е. На вуліцы спыняецца аўто з надпісам «ветдапамога». Двое ўрачоў пачынаюць абыходзіць дамы. Прышчэпкі для прафілактыкі робяць катам і сабакам. Кароў, свіней не чапаюць — у іх кантакту з драпежнікам не магло быць.

— Для вакцынацыі закупілі пяць тысяч аднаразовых шпрыцаў, — кажа **Аляксандр БРАЎКО, намеснік галоўнага ветурача раёна па хваробах сельскагаспадарчых жывёл,** і паказвае, што яшчэ ляжыць у яго жалезнай скрынцы — ватныя тампоны і спірт для асептыкі.

— Мінулыя гады, калі па вёсках хадзілі, чулі ад жыхароў: «Чаго вы хочаце? Майму сабаку прышчэпка не патрэбна, ён нікуды не бегае». А цяпер пагаджаюцца. «Гэта наконт воўка?» — удакладняюць. Адказваем, што так, і адразу папярэджваем — прышчэпка бясплатная, — дадае **вядучы ветэрынарны ўрач-эпізаатолаг Генадзь МАРКОЎСКІ.**

Вакцынацыі пазбягаюць толькі ўжо прышчэпленыя гадаванцы з пашпартамі (але такіх мала) і тыя, хто пакуль на лячэнні (напрыклад, пасля пералому лапы).

За брамкай з папярэджаннем «Асцярожна, злы сабака» брэша кудлаты вартаўнік. З дома паказваецца мужчына. Пачуўшы аб прышчэпцы, просіць пачакаць:

— Зараз сына паклічу, ён з сабакам больш сябруе.

Праўда, хлопец таксама губляецца: гадаванец немаленькі, з характарам, як яго ўтрымаць?

— Бярэш за поўсць каля шыі, вось так, заціскаеш паміж ног, — інструктуюць ветэрынары і за секунду робяць укол. Жывёла пакрыўджана збягае, а гаспадар расказвае, што навіна пра воўка яго асабліва не спужала, дадатковых мер бяспекі не прадпрымаў — сабака ж за брамку не выходзіць, толькі ў двары бегае.

— А хто такіх прышчэпліваць будзе? — ківае мужчына на хаты цераз дарогу. — Гаспадары ў Мінску жывуць, толькі на выхадныя прыязджаюць.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Намеснік галоўнага ветурача раёна Аляксандр БРАЎКО пазначае, гадаванцаў з якіх дамоў ахапілі вакцынацыяй.

Дарэчы

Летась у Стаўбцоўскім раёне зарэгістравалі 13 выпадкаў шаленства — гэта былі лісы і бадзяжныя каты.

— Ім трэба будзе самім на ветстанцыю жывёл прывезці. Перадайце, як убачыце.

У іншым доме дзверы адчыняе жанчына.

— Я ў бальніцы на перавязцы была, не ведаю, дзе кот. Віскі, Віскі!

На яе голас з агародаў прыбягае чорны кот, праціскаецца ў дом і ўсаджваецца на падаконніку.

— Вы яго патрымаеце? А то я баюся, — прызнаецца жанчына.

Пакуль ветэрынары праводзяць неабходную працэдуру, гаспадыня дзеліцца: у першыя дні пасля здарэння з воўкам у краму не выходзіла — усё ж такі лес ад вёскі блізка.

Па дарозе ўрачы ўспамінаюць: апошні выпадак шаленства ў воўка быў зарэгістраваны ажно ў 1982 годзе, у вёсцы Найдзёнавічы. Куды часцей сустракаюцца хворыя лісы (хоць неяк разносчыкам быў і янот).

— Вунь дом агароджаны сеткай-рабіцай: ліса праз яе лёгка пералазіць, як па лесвіцы. Быў выпадак — ліса забралася ў вальер да аўчаркі. Вядома, тая разарвала яе. Гаспадары своечасова не звярнуліся. А калі ўжо змяніліся паводзіны сабакі, прызналіся, што ён лісу загрыз. Тады зрабілі эўтаназію. Адправілі на даследаванне мозг гэтага сабакі — сапраўды, пацвердзілася шаленства.

Непрышчэпленых гадаванцаў, што былі ў кантакце з хворай жывёлай, часам прапануюць усыпіць. Медыкі ўздыхаюць: вядома, гэта самы жорсткі метад, але надзейны.

— Вакцына стапрацэнтнай гарантыі даць не можа, — тлумачаць. — Пасля прышчэпкі павінна прайсці не менш за 14 дзён, каб выпрацаваўся імунітэт. А зімой гэты тэрмін можа падоўжыцца да двух месяцаў — чаму і каранцін на такі перыяд.

Падазроных жывёл няма

Стоўбцы. У гарадской ветклініцы даволі ціха.

— А ўчора было не прысесці! Больш за 100 чалавек звярнуліся. Прышчапілі 62 каты і 43 сабакі, — заўважае **загадчык ветклінікі Вадзім ТАМАШЭВІЧ.**

У гэтыя дні ўстанова працуе без выхадных, з васьмі раніцы да васьмі вечара. Самы загружаны час — пасля 17 гадзін. Раніцай прыходзяць у асноўным пенсіянеры. Прычым хапае і тых, хто едзе з вёсак. Некаторым уколы даюць з сабой — напрыклад, бабулям, якія не могуць прывезці вялікага сабаку, што сядзіць на ланцугу.

Усяго па стане на чацвер у раёне за гэтыя некалькі дзён прышчапілі 368 катоў і 283 сабакі.

Хоць здарэнне было амаль тыдзень таму, мясцовыя жыхары абмяркоўваюць яго і дагэтуль. Кажуць, за адной з пацярпелых жанчын воўк літаральна гнаўся. Упала б — загрыз бы...

— У нас расказваюць, што воўк яшчэ на некага накінуўся, на кавалкі парваў, — перадавала чуткі (на шчасце, непацверджаныя) адна з гаспадынь, пакуль ветэрынары прышчэплівалі катоў на яе падворку.

Мясцовым жыхарам рэкамендуюць пакуль сачыць за гадаванцамі: ці п'е ваду, ці не паводзіць сябе занадта агрэсіўна або наадварот ласкава, ці не павысілася слінацячэнне. Але, запэўніваюць на ветстанцыі, падчас абходу падворкаў у горадзе і вёсках падазроных жывёл не было.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
Стаўбцоўскі раён.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже изолированного помещения

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – ОАО «АСБ Беларусбанк».

Наименование объекта продажи: изолированное помещение (назначение – административно-торговое помещение) общей площадью 580,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Пимена Панченко, 60–136.

ОАО «АСБ Беларусбанк» принадлежит доля в праве на земельный участок с кадастровым номером 500000000006006949 для эксплуатации и обслуживания здания многоквартирного жилого дома со встроенными нежилыми помещениями (право аренды).

Начальная цена продажи составляет 815 040,00 (восемьсот пятнадцать тысяч сорок рублей 0 копеек) с учетом НДС.

Сумма задатка – 8 150,40 (восемь тысяч сто пятьдесят рублей 40 копеек).

Открытый аукцион состоится 05.03.2019 в 10.00 по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 18, комната переговоров (помещение на первом этаже).

Заявление на участие принимается в рабочие дни с 9.00 до 17.00, в пятницу – до 15.45 по 04.03.2019 включительно по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 18, кабинет 338, тел.: (017) 309 05 43, (029) 632 06 83.

Продавец – ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается и регистрируется в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

По вопросам, связанным с организацией осмотра объекта продажи, обращаться по телефонам: (017) 309 06 60, (029) 145 13 87 – Баек Павел Александрович.

Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка по 04.03.2019 включительно на счет № BY66AKBB66708599005400000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Открытый аукцион проводится путем пошагового увеличения цены. Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной цены. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 20 рабочих дней со дня проведения открытого аукциона

Ликвидационная комиссия РУПП «Гроднотекстиль» объявляет о проведении повторного аукциона по продаже имущества

№ п/п	Наименование имущества	Стоимость с НДС	Сумма задатка 10 %
Лот № 1	Водопроводная сеть, 22,24 м, инвентарный № 400/С-72656 (сооружение специализированное коммунального хозяйства)	66,00	6,60
	Канализационная сеть, 129,1 м, инвентарный № 400/С-72659 (сооружение специализированное коммунального хозяйства)	192,55	19,26
Лот № 2	Кабельная линия 0,4 кВт, 83,5 м, инвентарный № 400/С-72680 (сооружение специализированное энергетики)	27,66	2,77

Имущество находится по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Богуцкого, 8. Торги состоятся 15 февраля 2019 года в 10.00 по адресу: г. Гродно, ул. Горького,121. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

– копия платежного поручения о внесении на счет РУПП «Гроднотекстиль» № BY32BLBB30120500048503001001, БИК BLBBBY2X в ОАО «Белинвестбанк» г. Гродно, УНП 500048503, суммы задатка по каждому лоту;

– копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица (индивидуального предпринимателя).

Документы должны быть представлены до 15.00 12 февраля 2019 года. Победитель аукциона возмещает затраты по организации и проведению аукциона. Телефон для справок (8 152) 43-99-64

МОЙ ДЗЕД ІВАН ДЗЯНІСАВІЧ

У Год малой радзімы (тэма ўвесь час на слыху) міжволі ўспамінаюцца вёскі і мястэчкі, свае вуліцы ды пад'езды ў гарадах і гарадках. А следам — гады дзяцінства, родныя людзі.

Мой шлях у самастойнасць, у жыццё пралягаў ад невялікай сялянскай хаткі пад заімшэлай гонтай, хаткі з вокнамі на ўсход і поўдзень — на сонца, пад праменнем якога залацелі, можна сказаць, адшараваныя дзеркачом маснічыны.

Гэты бляск — хіба адно імгненне з далёкай мінуўшчыны. А іх жа — мноства. І за кожным, згадзіцеся, прыкметы часоў і нораваў, характары асобных людзей.

Мой дзядуля, напрыклад, Іван Дзянісавіч Крывец, чалавек быў смелы, рахманы, любіў пажартаваць, пасмяяцца. І тады яго гучнае «ха-ха-ха» грымела на ўсю ваколіцу. Як і мянушка — Хахай.

У сям'і дзядулі было трое дзяцей і жонка-прыгажуня. Да таго ж характар яна мела вельмі пакладзісты: мужу, як правіла, ні ў чым не пярэчыла. Надумаў ён у заробкі махнуць, у Амерыку. «Добра, — згадзілася, — едзь». Бо ведала: пратэставаць — толькі нервы псаваць... Задумаў хутка вярнуцца? Гэта яшчэ лепш! Дарэчы, тая заможная краіна дзе-

да зусім не ўразіла. «Добра там, дзе нас няма», — казаў вяскоўцам Дзянісавіч. «Праверка боем» не збіла яго ганарліваści. Не збавіла яна і ўпартасці: калі дзед надумаў штось, — нікога не паслухае, зробіць па-свойму, пакуль...

Дамовіўся неяк Іван з суседам Пятром у горад матнуцца, пад Вадохрышча, у другой палоўцы дня.

Казалі ім, што дурное задумалі: мароз на дварэ — аж дрэвы трашчаць, бандытаў у лесе, як зор на небе, завідна не справяцца...

Мужыкі не чулі — паехалі.

...Дарогу дамоў ім асвятляла поўня. Конь, заінеўшы, бег трушком, палазы на бальшаку рыпелі, мужчыны ціха перамаўляліся ды з асцярогай пазіралі на лес, што падступаў абапал.

— Глянь наперад, Пятро. Нас, здаецца, чакаюць? — раптам прамовіў Іван.

— Усё... Значыць, тут і скапыцімся, — спужаўся сусед.

— Ды не, брат... Рызыкнём, — зашаптаў Іван. — Слухай мяне ўважліва. Я зніму свой кажух (дзед, дарэчы, з Амерыкі яго прывёз — прыгожы быў...) і ўскіну сабе на плечы. А ты, як толькі з бандай зраўняемся і хто да мяне памкнецца, сцебані канька, каб ён на галоп перайшоў. Зразумеў?

— А як жа!

Тым часам бандыты побач. Адзін ужо за вобраць бярэцца, другі — за дзедаў каршэнь — за кажух... І раптам конь іх рвануў уперад ды так, што першы злодзей застаўся ляжаць на снезе, а другі — стаяць... Хоць і з кажухом.

Што адбылося, да іх дайшло не адразу. А калі зразумелі, Пятро з Іванам ужо далёка ад'ехалі. І амаль не пацярпелі, калі не лічыць страты кажуха ды таго, што з дзясятак вёрст на лютым марозе дзядуля праехаў, можна сказаць, без вопраткі. Доўга потым хварэў на запаленне лёгкіх. І хоць трохі, але стаў прыслухоўвацца да таго, што кажа бабуля.

Ніна Бурко,

в. Капланцы, Бярэзінскі раён.

АД СВАЙГО ЗЛОДЗЕЯ

...Зруб паставіць, дах накрыць, студню выкапаць, парсюка закалоць — не абысціся ў вясковым жыцці без старонняй дапамогі, без талакі і, адпаведна, без вадкай валюты. Але ж яе паспрабуй займей — купі альбо нагані, а потым — прымудрыся схаваць.

Ад міліцыі нашай цётцы Тамары заўсёды ўдавалася, а вось ад мужа — пакуль што не. У яго нюх на гэты прадукт, не раўнуючы, як у спецыяльна абучаных сабак на наркотыкі... Усюды знаходзіў: і на печы, і пад печчу, а яшчэ — у градах, у дровах, у сене, у бочцы з квашанай капустай, у студні... У цёткі галава ішла кругам: не ведала, што і рабіць, думала, няўжо праўда, што ад свайго злодзея нічога не схаваеш? І нідзе. Хіба...

Па суседстве з імі жыў Іван. Як быццам прыстойны чалавек, з паважанай сям'і, але ж — так склалася — застаўся бабылём. І яшчэ неяк трымаўся, пакуль маці жыла, а потым...

Гарэлка стала найлепшай сяброўкай. Напіваўся часам да таго, што на нагах не стаяў, сваіх не пазнаваў, у людзей пытаў, якая гэта вёска і дзе яго хата?

А будыніна ж там адметная, пяцісценная: у адной палове жылое памяшканне з мэбляю, з печчу (Іван не забываўся яго запіраць на замок). А вось другое, можна сказаць, пустое, служыла яму як сені. Там нават падлогі людскай не было, толькі чарнавая — дошкі дзе прыбіты, дзе не... І дзверы адпаведна заўсёды адчынены. Заходзь, калі хочаш.

Вось цётка Тамара і падумала, што тут, у Івана, яе муж ніколі гарэлку не знойдзе, бо не будзе шукаць. Па-першае — чужая ж хата, па-другое — які гаспадар...

А таму ў яго адсутнасць суседка неяк раз прынесла трохлітровік сваёй самаробнай і паставіла яго пад падлогай, каля дзвярэй — там якраз дошка была не прыбітая, лёгка паднялася.

«Ну вось займела схованку! Хоць нарэшце!» — парадавалася жанчына і нейкі час спакойна пажыла, пакуль не прыкмеціла, што і муж яе, і сусед пад добраю мухай... І ў нядзелю, і ў панядзелак, і ў аўторак з серадой...

Выбрала момант — на золаку, калі ўсе спалі, праверыла свой тайнік. Так і ёсць... А дакладней — няма (?!) яе самагоначкі.

...Іван потым расказаў, як, прыйшоў дамоў нападпітку, як, захацеўшы дзверы адамкнуць, «цаляў» ключом у замочную шчыліну, аж пакуль той «не вырваўся» з рук, не заваліўся ў дзірку паміж сцяной і падлогай. Каб дастаць, прыйшлося падняць дошку, а там...

Спачатку — расказваў — яму здалося, што два трохлітровікі. Памацаў рукой — адзін, але ж поўны! Зняў накрыўку...

Дзядзькаў твар, нават тады, калі ён расказваў пра гэта, я апісаць не змагу — не хопіць таленту!

А вось фінал у гэтай гісторыі прадказальны: насварыўшыся на мужчын (хоць з імі, ведала, дзе сядзеш, там і злезеш), цётка зноў стала думаць, што трэба выгнаць гарэлкі і недзе яе схаваць.

Аляксандр Матошка,

в. Янкавічы, Расонскі раён.

СМЕЛЫ РЭВІЗОР

Каля ўвахода ў першы корпус Беларускага тэхналагічнага ўніверсітэта не так даўно з'явілася бронзавая фігура ляснічага. І ўсё ў ёй як мае быць: што рост у мужчыны, што плечы, што твар... У руках прылада, якой мераюць дыяметры дрэваў... Але ж ёсць адзін недахоп — у звычайных туфлях дрэвы палічыш хіба ў парку Чалюскінцаў, бо ў лесе так і глядзі, каб на нешта не ўзбіцца. Прычым калючае ды вострае — гэта палова бяды. Я ў маленстве ўбачыў, як гадзюка «цалуе» мой літы бот. І гэтага аднаго было дастаткова, каб, працуючы ў лесе, ніколі не здымаць іх.

Але ж зараз не пра гэта, а пра тое, што працу леснікоў вельмі любілі (а мо і любяць?) правяраць розныя начальнікі. Нічога не скажу: яны, як правіла, ведалі вытворчасць, мелі досвед працы, шмат што разумелі, але ж былі і выключэнні.

Дык вось неяк у наш патрапаны гадамі і нялёгкімі дарогамі «козлік» садзіцца чарговы рэвізор. Мала таго, што малады, што звалiўся як снег на галаву, прычым з вельмі высокай інстанцыі, дык яшчэ і ў лёгкіх парусінавых туфліках. Мы з ляснічым паспрабавалі сказаць яму, што на машыне да дзялянак наўрад ці даедзем — кіламетраў колькі прыйдзецца трапаць пехатой, бо разводдзе, і ў лесе яшчэ не падсохла... На што малады чалавек досыць рэзка адказаў, што яго не трэба палохаць: абутак, маўляў, надзейны, турысцкі, што вада ў яго як нальецца, так і выльецца. «Ну-ну», — усміхнуліся мы і да першага аб'екта (дарэчы, з добрага тузіна прызначаных для праверкі) з горам папалам дабраліся. А там наш «джып» безнадзейна сеў на масты. Мы патэлефанавалі трактарысту, каб выцягнуў на сухое, і далей пайшлі пехатой.

Рэвізор, бачылі, па-ранейшаму трымаецца з форсам, абыходзіць ці пераступае шматлікія лужыны. Калі ж яны зліліся ў суцэльную, адважна заклыпаў наўпрост — у мокрых да каленяў портках, у аблепленых граззю туфлях...

Але ж і плюсы былі: зверху на нас свяціла сонейка, спявалі птушкі, наперадзе ўрэшце паказаўся сухі пагорак, і хлопец, апярэдзіўшы нас, ва ўсе лапаткі рвануў туды. А дабег і... застыў на месцы.

Мы, параўняўшыся, убачылі прычыну — пагорак літаральна кішэў змеямі.

В случае нарушения сроков проектирования и строительства в договоре аренды будут предусмотрены штрафные санкции.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1. Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении. **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов. **Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2. Платеж за право заключения договора аренды земельных участков осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.

3. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, возместить отделу коммунального имущества и приватизации Гродненского горисполкома расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

4. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектом.

Аукцион состоится 19 февраля 2019 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1.

Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 403, в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 с 4 февраля по 13 февраля 2019 года**. Телефоны для справок в Гродно: **(0152) 74-20-95, 72-05-37, 72-05-46**. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

УП «Белконфискат»

обьявляет о проведении электронных торгов 25.02.2019 г. по продаже имущества, изъятого у Шапель В. В.

Автомобильный прицеп «МАЗ-81144», 1990 г. в., начальной стоимостью 193 рубля. На сайте Belkonfiskat.by размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них. Справки по тел.: 8 (017) 2269489, 8 (029) 7790809.

УНП 190431606

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. На гэтым тыдні варта стрымаць жаданне выдаваць крытычныя каментарыі па любой нагодзе. Вашу з'едлівасць запомняць надоўга, і ў патрэбны момант можаце апынуцца без падтрымкі толькі таму, што мелі неасцярожнасць ляпнуць нешта крыўднае. У панядзелак і аўторак атрымаецца зрабіць на партнёраў спрыяльнае ўражанне. У чацвер будзьце гатовыя да выпрабавання, але вы пераадолееце цяжкасці. У нядзелю душа папросіць спакою і адзіноты, зрабіце сабе перадышку, гэта спрыяльна адаб'ецца на здароўі.

ЦЯЛЕЦ. На гэтым тыдні спатрэбіцца садзейнічанне ўплывовых знаёмых і надзейных сяброў. Добрае будзе выяўляцца незаўважна: сустрэчы з сябрамі, новыя магчымасці на працы, занятак спортам. Будзьце актыўныя ў прафесійных справах, не чакайце, пакуль вашы дасягненні хто-небудзь прысвоіць. У чацвер рэкамендуецца быць напагатове і не спрачацца па дробязях. У выхадныя пэўныя цяжкасці будуць падпільноўваць у хатніх справах і ў зносінах з дзецьмі.

БЛІЗНЯТЫ. На гэтым тыдні пры мінімуме намаганняў зможаце змяніць сваё жыццё да лепшага, прычым як асабістае, так і прафесійнае. Вас чакае выкананне многіх жаданняў. Гэта час, калі мары становяцца рэальнасцю. Зможаце закласці асновы для новых здзяйсненняў. Плённай будзе творчасць, адыход ад традыцыйных прынцыпаў, крэатыўныя ідэі. Не бойцеся выйсці з зоны камфорту, зрабіць штосьці новае і нечаканае.

РАК. Гэты тыдзень — удалы час для прымірэння і праявы аптымістычнага погляду на жыццё. Шчырасць, дабрыня і шчодрасць прынясуць поспех. У панядзелак варта часова звузіць кола зносін, не расходуйце сілы на пустую балбатню. У аўторак жаданні пачнуць выконвацца, калі яны не зусім фантастычныя. Дэвіз на пятніцу: «Спакой і толькі спакой» — што б ні здарылася, не раздражняйцеся. У нядзелю лепш устрымацца ад актыўнай дзейнасці ў любых сферах.

ЛЕЎ. На гэтым тыдні вы зможаце вылучыць галоўнае, вызначыць мэту, і тады ёсць імавернасць яе дасягнуць. У панядзелак ці аўторак перад вамі могуць адкрыцца новыя далягляды. У чацвер магчымыя пэўныя праблемы юрыдычнага плана, вытокі якіх знаходзяцца ў нядаўнім мінулым, але з якімі ўдасца справіцца ў канцы тыдня. Блізкія людзі праявяць клопат і ўвагу, іх дапамога будзе адчувацца ва ўсім, гэта будзе падтрымліваць і радаваць.

ДЗЕВА. Каб пазбегнуць ускладненняў на працы, не старайцеся перакласці свае справы на іншых. Аўторак абяцае быць супаратым. Паспрабуйце не ўпадаць у дэпрэсію, тужлівыя думкі ганіце ад сябе прэч. У сераду ўменне знайсці агульную мову з рознымі людзьмі абяцаюць вам поспех і прыбытак. Субота можа стаць днём прасоўвання наперад, калі хочаце нешта змяніць у сваім жыцці — дзейнічайце.

ШАЛІ. Надыходзіць цікавы час, багаты на разнастайныя падзеі. Працы — непачаты край, дзе ёсць месца і для творчасці, і для рэалізацыі новых і старых ідэй. Вынікі будуць прама прапарцыянальна залежаць ад затрачаных сіл, натхнення і добрасумленнасці. Аднак старайцеся не ўзвальваць на сябе занадта шмат. Лепш за ўсё працаваць у камандзе.

СКАРПІЁН. У працы нядрэнна б заняцца новымі і нявывучанымі напрамкамі. Але ў любым выпадку пазбягайце радыкальных рашэнняў, новае павінна стварацца паступова. У вас цяпер у прафесійнай і асабістай сферах вельмі камфортная сітуацыя. Тыдзень можа быць звязаны са значнымі падзеямі, якія адбываюцца ў вашым жыцці. Памятайце пра адказнасць за тых, каго прыручылі. У выхадныя не сядзіце дома, зазірніце да сяброў.

СТРАЛЕЦ. У панядзелак спаборніцтва з раптоўнымі канкурэнтамі можа паглынуць усе вашы думкі, паспрабуйце своечасова спыніцца. Вам нічога не трэба нікому даказваць, галоўнае — упэўненасць у сабе. У сераду не шкадуйце сіл і часу на сям'ю. Чым больш вы аддаяце цяпла і клопату, тым больш атрымаеце ўзамен.

КАЗЯРОГ. Выдатны тыдзень для творчасці і кар'еры. Ваша працаздольнасць здзівіць усіх, і вас у першую чаргу. Засяроджанасць і паслядоўнасць у справах будзе адзначана, і ёсць шанец, што ўзнагароджана. Не варта шмат расказваць, асабліва пра асабістае, ды і пра чужыя тайны. Больш слухайце, інакш можаце прапусціць важную інфармацыю, звязаную з найбліжэйшай будучыняй. У выхадныя будзьце вельмі асцярожныя са спакусамі і не хваліцеся дасягненнямі.

ВАДАЛІЙ. Вы як ніколі раней блізкія да таго, каб дасягнуць вяршыні ў кар'еры. На гэтым тыдні мора вам будзе не вышэй калена, цяжкасці будуць толькі распаляць і з'явяцца стымулам да развіцця. У сераду вы станеце занадта недаверлівыя, але блізкія людзі вам не хлусяць. У пятніцу могуць адбыцца важныя падзеі ў сямейным жыцці. У нядзелю лепш не мітусіцца і не даваць пустых абяцанняў.

РЫБЫ. Зможаце дасягнуць вялікіх поспехаў у рэалізацыі тых задач, якія дыктуюцца імгненнай неабходнасцю. Толькі пазбягайце паспешлівасці, рабіце ўсё калі не па вызначаным загадзя плане, то хаця б паслядоўна. Змены, якіх вы так доўга чакалі, не наступяць без вашай актыўнасці. Вельмі карысна раіцца з калегамі і часцей выходзіць у свет. Новыя знаёмствы могуць адыграць важную ролю ў вашым жыцці. Калі будзеце спакойныя і ўпэўненыя ва ўласных сілах, то можаце разлічваць на шанцаванне і поспех.

Даты Падзеі Людзі

1 ЛЮТАГА

У краіне

1484 год — меркаваная дата нараджэння Яна Вісліцкага, паэта-лацініста ВКЛ. Месца і дакладная дата нараджэння паэта невядомыя, як і сапраўднае прозвішча. Вісліцкі — псеўданім паэта, як мяркуецца, звязаны з назвай ракі Вісліца, што працякае недалёка ад Клецка. Магчыма, псеўданім быў узяты паэтам як напамін пра родныя мясціны. Вядома, што ён скончыў Ягелонскі ўніверсітэт у Кракаве і затым працаваў ва ўніверсітэце магістрам. Вісліцкі пісаў оды, эпіграмы, элегіі, але еўрапейскую вядомасць яму прынесла гістарычная паэма ў трох кнігах «Пруская вайна», асабліва другая яе кніга, прысвечаная Грунвальдскай бітве. У мастацкім апісанні падзей аўтар абапіраўся як на гістарычную хроніку, так і на вусныя легенды і паданні. Памёр у 1520-я гады.

1904 год — нарадзіўся Рыгор Аляксеевіч Качаткоў, беларускі акцёр, народны артыст Узбекістана, народны артыст Беларусі. З 1950 года працаваў у Дзяржаўным рускім драматычным тэатры Беларусі, адначасова выкладаў у Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. Сыграў шэраг драматычных і характарных роляў у спектаклях класічнага і нацыянальнага рэпертуару: Цыганоў, Ягор Булычоў («Варвары», «Ягор Булычоў і іншыя» М. Горкага), Калеснікаў, Карнілаў («Брэсцкая крэпасць», «Галоўная стаўка» К. Губарэвіча) і інш. Памёр у 1968 годзе.

1913 год — нарадзіўся Сяргей Восіпавіч Прытыцкі, дзяржаўны і палітычны дзеяч Беларусі, дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, адзін з арганізатараў антыфашысцкага падполля і партызанскага руху ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. З 1968 — года старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, намеснік старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Памёр у 1971 годзе.

1944 год — Беларускі штаб партызанскага руху перабазіраваўся з Масквы ў пасёлак Чонкі Гомельскай вобласці.

1949 год — нарадзіўся Міхаіл Аляксандравіч Карчміт (вёска Радзеўцы Маладзечанскага раёна), беларускі гаспадарчы дзеяч, Герой Беларусі, заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі. З 1988 года — старшыня праўлення агракамбіната «Сноў» Нясвіжскага раёна, Мінскай вобласці. У 1997 — 2004 гадах — член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Распрацаваў і ўкараніў новыя перспектыўныя сарты азімай пшаніцы. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Памёр у 2004 годзе.

У свеце

2014 год — пачалося будаўніцтва трэцяй лініі Мінскага метрапалітэна, якая злучыць паўднёвыя і паўночныя раёны горада з цэнтрам.

1857 год — нарадзіўся Уладзімір Міхайлавіч Бехцераў, рускі неўролаг, псіхіятр і псіхолаг, заснавальнік расійскай неўралагічнай навуковай школы. Яго імем названа вуліца ў Мінску. Памёр у 1927 годзе.

1884 год — пачаўся выпуск першага выдання Вялікага Оксфардскага слоўніка — аднаго з найбольш вядомых акадэмічных слоўнікаў англійскай мовы. Выданне мела 10 тамоў і выходзіла да 1928 года.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.57	17.50	8.53
Віцебск —	8.51	17.35	8.44
Магілёў —	8.47	17.40	8.53
Гомель —	8.38	17.42	9.04
Гродна —	9.11	18.06	8.55
Брэст —	9.06	18.12	9.06

Месяц

Апошняя квадра 28 студзеня.
Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Антона, Арсенія, Макара, Марка, Мікалая, Пятра, Фёдара.*
К. *Ігната.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Марыя, а праўду кажуць, што вас Уладзімір кінуў?

— Ды я вас прашу! Кінуў ён... Падняць не змог...

Няпоўныя і нетрадыцыйныя сем'і — гэта тыя, у якіх няма катоў.

Мужык, рыбак-фанатык, ажаніўся другі раз. Недзе праз месяц прыходзіць на лёд, увесь пабіты, з сінякамі. Садзіцца і моўчкі пачынае вудзіць рыбу. Сябры падышлі, пытаюцца, што здарылася. Ён неахвотна расказвае:

— Ну, вось прыходжу на мінулым тыдні дахаты, жонка пытаецца: «Дзе быў?» Я ёй аддаў рыбу, кажу: «На рыбалцы быў». Яна зноў пытаецца: «Дзе быў?» Я: «Не бачыш, на рыбалцы!» Яна: «Апошні раз пытаюся — дзе быў?» Я зноў: «На рыбалцы!..» Хто ж мог падумаць, што яна ведае, што ў Нёмане мінтай не водзіцца...

Жанчыны адчыняюць шафу, поўную адзення, доўга думаюць і выдаюць: «Няма чаго надзець!»

Мужыкі адчыняюць халадзільнік, поўны ежы, доўга думаюць і выдаюць: «Няма чаго паесці!»

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 585.

Нумар падпісаны ў 19.30 31 студзеня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

1 лютага 2019 г. № 5 (490)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ТЭМА ТЫДНЯ

Фота БелТА.

Дасягаем разам — працуем на будучыню

ПЕРШЫ Нацыянальны форум па ўстойлівым развіцці прайшоў у сталіцы на мінулым тыдні. На ім прадстаўнікі бізнесу, грамадскасці, улады і міжнародных арганізацый абмеркавалі, як наша краіна будзе рухацца да дасягнення 17 Мэт устойлівага развіцця. Ужо прайшло тры гады, як МУР былі прынятыя. Прамежкавыя вынікі для нашай краіны падводзілі на чатырох сесіях — гэта блокі, прысвечаныя эканоміцы, экалогіі, сацыяльным пытанням і сістэме маніторынгу разам з ацэнкай імплементацыі Мэт.

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ адзначыў падчас адкрыцця форуму, што гэты год асаблівы. «Рэспубліканскімі і мясцовымі органамі кіравання, прадпрыемствамі трэба будзе забяспечыць рэалізацыю задач, сфармуляваных ва ўказе Прэзідэнта Беларусі аб сацыяльна-эканамічным развіцці ў 2019 годзе, і прыступіць да распрацоўкі праекта асноўных напрамкаў развіцця Беларусі да 2025 года. Задача няпростая: у 2025 годзе выйсці на аб'ём ВУП у 100 мільярдаў долараў ЗША ў эквіваленце», — растлумачыў спікер. Ён заўважыў, што МУР — арганічная састаўная частка сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Міхаіл Мясніковіч спадзяецца, што нацыянальны кангрэс будзе актыўны і, улічваючы дасягнутыя вынікі работы па МУР, выпрацуе прапановы па росце эканомікі Беларусі і ўзроўні жыцця яе грамадзян на перспектыву. «Задача ў нас агульная — павышэнне якасці жыцця насельніцтва на аснове росту канкурэнтаздольнасці эканомікі і інавацыйнага развіцця», — рэзюмаваў ён.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА нагадаў, што наша краіна прымала актыўны ўдзел у распрацоўцы Парадку-2030.

«Па сутнасці, менавіта прыярытэты ўстойлівага развіцця вызначаюць унутраную і знешнюю палітыку Беларусі. Гэта заканамерна, бо ў аснове МУР блізкая і зразумелая нашаму народу ідэя сацыяльнай справядлівасці, якая першапачаткова закладзена ў аснову беларускай дзяржаўнасці», — тлумачыць спікер ніжняй палаты парламента. Уладзімір Андрэйчанка адзначыў патэнцыял нашай эканомікі і ўмацаваны аўтарытэт Беларусі ў сусветнай супольнасці. «Ва ўлады ёсць дакладная стратэгія і напрацаваныя механізмы пераадолення крызісных з'яў. Але галоўнае — у нас якасна змянілася свядомасць людзей. Наяўнасць грамадзянскага міру, адсутнасць канфліктаў на нацыянальнай і канфесійнай глебе — гэта найважнейшыя паказчыкі кансалідацыі грамадства, узрослага ўзроўню яго прававой, эканамічнай і палітычнай культуры. І сёння гэта наш ключавы рэсурс устойлівага развіцця», — лічыць спікер.

Па словах парламентарыя, каб Беларусь і далей працягвала дынамічна развівацца, вельмі важна захаваць згуртаванасць нацыі і давер народа да ўлады. «Забеспячэнне дабрабыту краіны — гэта перш за ўсё справа самой краіны і яе грамадзян. Таму прынцып сацыяльнай справядлівасці азначае для нас адначасова і сацыяльную салідарнасць. Кожны павінен унесці свой пасільны ўклад у агульную справу», — падвёў вынікі Уладзімір Андрэйчанка.

стар. 3

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

«Зялёная» чацвёрка

Якая дзейнасць у галіне экалогіі павінна стаць прыярытэтнай? стар. 4

Маладзейшымі не становімся...

Каля 15 % насельніцтва — старэйшыя за 65 гадоў. Што чакае далей? стар. 13

Інфраструктура развіваецца

Новая школа адкрыецца 1 верасня ў маладым гродзенскім мікрараёне Альшанка. стар. 15

Шанц на працу

На Валожыншчыне больш за тысячу чалавек уключаны ў спісы не занятых у эканоміцы. стар. 16

Ізноў «Горка!»

У Клецку плануюць узнавіць старадаўнія вясельныя строі. стар. 16

КРАСНОАРМЕЙСКАЯ, 9

Пример для других стран

Вице-спикер верхней палаты белорусского парламента, Национальный координатор по ЦУР Марианна Щеткина в минувшую пятницу, 25 января, встретилась с помощником Генерального секретаря ООН, директором Регионального бюро ПРООН по странам Европы и СНГ Мирьяной Сполярич Эггер.

Во встрече также участвовали члены Президиума Совета Республики Алла Бодак и Виктор Сиренко, представители МИД, Минэкономики, Постоянный координатор ПРООН в Беларуси Иоанна Казана-Вишневецкий и другие.

Как сообщает пресс-служба Совета Республики, участники обсудили итоги первого Национального форума по устойчивому развитию, а также дальнейшие перспективы сотрудничества со структурами ООН.

Мирьяна Сполярич Эггер высоко оценила проводимую в нашей стране работу по достижению Целей устойчивого развития (ЦУР), которая достойна быть примером для других стран. Важно, что деятельность по реализации Целей ведется по тематическим направлениям, таким как экономика, социальная политика, экология и мониторинг достижения Целей. В Беларуси выстроена эффективная система взаимодействия между правительством и парламентом, к сотрудничеству привлекаются деловые круги и общественные организации.

В рамках визита в белорусскую столицу госпожа Эггер встретилась с руководством ряда профильных министерств, где были достигнуты договоренности развития контактов, плодотворного и взаимовыгодного партнерства, в том числе в контексте реализации Повестки-2030.

Помощник Генерального секретаря ООН отметила заинтересованность организации в укреплении сотрудничества с Беларусью и стремление синхронизировать свои планы с планами правительства в части реализации Национальной стратегии устойчивого развития страны на период до 2035 года.

Со своей стороны Марианна Щеткина поблагодарила за оказываемую поддержку и сотрудничество по вопросам реализации ЦУР. Она напомнила, что в Беларуси намерены в первую очередь активизировать деятельность по достижению Целей на местном уровне, активно привлекать к их осуществлению молодежь. Национальный координатор предложила обсудить наиболее актуальные вопросы, представляющие взаимный интерес.

Чего не хватает спутникам?

Постоянная комиссия Совета Республики по экономике, бюджету и финансам провела круглый стол.

В Китайско-белорусском индустриальном парке «Великий камень» прошел круглый стол профильной комиссии Совета Республики на тему «О практике применения Закона «Об архитектурной, градостроительной и строительной деятельности в Республике Беларусь».

В мероприятии приняли участие председатель Смолевичского райисполкома Михаил Загорцев, глава администрации Китайско-белорусского индустриального парка «Великий камень» Александр Ярошенко, представители Минстройархитектуры, местных исполнительных и распорядительных органов власти, руководители проектных и строительных организаций, сообщается на сайте верхней палаты белорусского парламента.

Во время проведения круглого стола были затронуты вопросы совершенствования законодательства в строительной сфере, перспективы развития городов-спутников Минска на примере города Смолевичи, проблемные аспекты проектной деятельности. Участники отметили важность и своевременность разработки Кодекса об архитектурной, градостроительной и строительной деятельности, в котором должны получить развитие нормы Декрета Президента Республики Беларусь № 7 «О развитии предпринимательства».

Предложения участников круглого стола будут направлены в Минстройархитектуры для учета при подготовке проектов нормативных правовых актов, регулирующих работу строительной сферы.

КРУГ ПРИОРИТЕТОВ

Беларусь заинтересована в расширении сотрудничества с Индией в фармпромышленности

СПИКЕР верхней палаты белорусского парламента, уполномоченный по сотрудничеству с Индией Михаил МЯСНИКОВИЧ заявил об этом встречаясь во вторник, 29 января, с почетным консулом Беларуси в Мумбаи Лалитом ЧОКАНИ.

sovrep.gov.by

Как сообщает пресс-служба Совета Республики, на встрече обсуждались вопросы торгово-экономического и инвестиционного сотрудничества.

Фармацевтика является наиболее перспективной сферой взаимодействия двух стран, подчеркнул Михаил Мясникович. Одно из главных преимуществ сотрудничества индийских компаний с нашей страной – возможность выхода на рынок стран ЕАЭС. «Совместно мы можем успешно реализовать крупные и взаимовыгодные проекты», – убежден председатель Совета Республики.

С участием индийского капитала в Беларуси строятся три фармацевтических завода: в Бешенковичах (Витебской области), Скиделе (Гродненской области) и Колядичах (Минской области). В августе минувшего года Национальная академия наук Беларуси и индийская фармацевтическая компания CIPLA положили начало еще одному совместному проекту по созданию научно-технологического центра по выпуску лекарственных препаратов в Минске. Спикер верхней палаты белорусского парламента обратил внимание на необходимость ускорения работ по этому проекту и предложил разработать дорожную карту его реализации с конкретными сроками подготовки площадки и начала строительства. По его убеждению, работы надо форсировать, причин для замедления не существует.

Кроме того, председатель Совета Республики напомнил о возможности участия индийских инвесторов и в проекте по созданию крупного мультимодального промышленно-логистического центра в поселке Болбасово, что под Оршей. «Если бы индийский бизнес пришел сюда, это было бы выгодно как для Беларуси, так и для Индии. Направлений деятельности может быть несколько – производство, логистика, сфера услуг», – отметил он.

Во время переговоров также обсуждалась возможность сотрудничества двух стран в сфере образования и медицинского туризма.

Лалит Чокани считает, что у наших стран хорошие перспективы для дальнейшего сотрудничества. Деловые круги Индии интересуются белорусским рынком по ряду направлений. Он также предложил организовать в Минске в августе текущего года встречу председателя Совета Республики с почетными консулами в Индии, Бангладеш, Шри-Ланке для обсуждения перспектив взаимодействия и возможностей реализации совместных проектов. Михаил Мясникович поддержал это предложение.

Во встрече принял участие руководитель аппарата НАН Беларуси академик Петр Витязь.

* * *

Днем позже, 30 января, спикер верхней палаты белорусского парламента провел встречу с Чрезвычайным и Полномочным Послом Азербайджана в Беларуси Латифом ГАНДИЛОВЫМ, во время которой стороны подтвердили намерения активно развивать всестороннее сотрудничество, сообщает пресс-служба Совета Республики.

Михаил Мясникович отметил положительную динамику взаимодействия двух стран по многим направлениям. Укреплению двустороннего партнерства содействуют теплые и доверительные отношения между главами государств. «Мы прибавили по всем направлениям сотрудничества. В Азербайджане созданы совместные производства, которые будут работать не только на внутренний рынок страны, но и сопредельные государства», – подчеркнул председатель Совета Республики. Беларусь создает комфортные условия для работы азербайджанского бизнеса. Есть успешные примеры реализации инвестиционных проектов.

Дипломат поддержал это мнение и отметил заинтересованность в укреплении инвестиционного сотрудничества. «Совместных компаний может быть больше», – заявил посол и предложил проработать возможность подписания документов о сотрудничестве между крупными технопарками Азербайджана и Китайско-белорусским индустриальным парком «Великий камень». Латиф Гандилов также проинформировал о совместных с белорусскими партнерами планах по выпуску электробусов в городе Гянджа.

В зоне особого внимания

В Совете Республики под руководством председателя Постоянной комиссии по региональной политике и местному самоуправлению Александра ПОПКОВА на минувшей неделе прошло совещание, касавшееся вопросов реализации приоритетных направлений в области аграрной политики Союзного государства, определенных на V Форуме регионов Беларуси и России.

По итогам работы секции № 1 «Аграрная политика Союзного государства: опыт, проблемы, перспективы» в рамках V Форума определены три приоритетных направления сотрудничества. Первое – формирование единой системы генетических ресурсов в племенном животноводстве и создание селекционно-генетических центров. Второе – разработка систем машин и внедрение ресурсо- и энергосберегающих технологий в агропромышленном производстве. Третье – повышение качества аграрного образования, обмен опытом и совместная подготовка кадров для агропромышленной отрасли Беларуси и России.

Как сообщили в профильной комиссии Совета Республики, в рамках реализации первого направления ученые двух стран разработали проект концепции научно-технической программы по созданию единой базы генетических ресурсов племенного животноводства стран – участниц Союзного государства, одобренный Минсельхозпродом Беларуси. В настоящее время проект находится на рассмотрении в российском Министерстве сельского хозяйства и должен быть подписан в ближайшее время.

Что касается реализации второго направления, Научно-практический центр НАН Беларуси по механизации сельского хозяйства совместно с Всероссийским институтом механизации подготовили проекты концепций научно-технических программ по разработке интеллектуальных технологий и роботизированных технических средств в промышленном садоводстве, а также цифровых технологий и автоматизированных машин в молочном животноводстве. Проекты этих концепций направлены на рассмотрение в Министерство сельского хозяйства Российской Федерации и НАН Беларуси. Кроме того, ученые обсуждают целесообразность подготовки проекта концепции научно-технической программы по разработке инновационных технологий и оборудования для производства зерновых культур и травяных кормов на основе принципов «точного земледелия».

Для повышения качества аграрного образования и совместной подготовки кадров Минсельхозпрод Беларуси разработал и направил на рассмотрение российским коллегам проекты соглашения о сотрудничестве в области аграрного образования и науки, концепции Программы профессиональной подготовки и повышения квалификации кадров для АПК Союзного государства Беларуси и России на 2020–2024 годы, а также Положения о создании совместного образовательного центра для АПК Беларуси и России. В настоящее время документы обсуждаются с российской стороной.

По итогам совещания, в котором участвовали генеральные директоры научно-практических центров НАН Беларуси по животноводству и механизации сельского хозяйства Николай Попков и Сергей Яковчик, начальник главного управления образования, науки и кадров Минсельхозпрода Владимир Самсонович и другие, принято решение продолжить работу по реализации итогов V Форума регионов Беларуси и России в области аграрной политики и в ближайшее время рассмотреть с российскими партнерами возникшие проблемы.

Дасягаем разам — працуем на будучыню

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей РУМАС упэўнены, што падобныя сустрэчы на высокім узроўні для разгляду прагрэсу ў выкананні парадку дня ААН стануць добрай традыцыяй. На думку кіраўніка Саўміна, фармат форуму дазваляе ўмацаваць міжнароднае партнёрства і дае магчымасць для дэманстрацыі дасягненняў на нацыянальным узроўні. «Праз амаль 3,5 года пасля адабрэння дзяржавамі ААН Парадку-2030 значнасць гэтай сусветнай праграмы дзеянняў у сферы развіцця відавочная. Перыяд усведамлення задач, якія паставіла перад сабою сусветная супольнасць, завершаны. Наступіў этап ажыццяўлення Мэт устойлівага развіцця, замацаваных у дакументе, што азначае штодзённую карпатлівую працу», — падкрэсліў Сяргей Румас. Ён звярнуў увагу, што пытанні рэалізацыі Парадку дня ААН і дасягнення МУР з'яўляюцца важным дзяржаўным прыярытэтам і знаходзяцца ў цэнтры ўвагі Савета Міністраў. Таксама ён нагадаў, што ўжо сёлета будзе сфарміравана Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця краіны да 2035 года.

Падчас работы форуму ў дадатак да работы на секцыях прайшла прэзентацыя праекта «Садзейнічанне Рэспубліцы Беларусь у нацыяналізацыі і лакалізацыі Мэт устойлівага развіцця». Працоўны дзень быў насычаны, і яго вынікі падвяла **нацыянальны каардытанар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Мар'яна ШЧОТКІНА.** Яна падзякавала парламенцкай групе за законы, якія ўжо прынятыя і садзейнічаюць дасягненню МУР. Нарэшце ў законе аб пітным водазабеспячэнні, які вяртаўся на дапрацоўку амаль на два гады, усё улічана, прывяла прыклад сенатар. Акрамя таго, яна адзначыла інавацыйны закон аб арганічным земляробстве, а таксама аб нарматыўна-прававых актах, у якім указана, што разам з кожным законапраектам павінна быць удакладненне, як ён працуе на дасягненне МУР.

«Сённяшні форум — гэта пацвярджэнне нашага партнёрства», — сказала Мар'яна Шчоткіна, азначыўшы, што на мерапрыемстве прадстаўлены ўвесь спектр грамадства. — Лозунг форуму «Ва ўстойлівую будучыню — разам!» кажа пра тое, што дасягаць МУР мы павінны таксама супольнымі намаганнямі, нікога не пакідаючы ўбаку. Ёсць прапанова, каб праводзіць Нацыянальны форум па ўстойлівым развіцці не радзей, чым адзін раз на пяць гадоў.

Надзея АНІСОВІЧ.

У тэму

Па выніках экспертна-кансультацыйнай місіі MAPS («Інтэграцыя, паскарэнне і падтрымка палітыкі»), якая была арганізавана ААН у супрацоўніцтве з Беларуссю, наша краіна дасягнула значных поспехаў ва ўстойлівым развіцці. У Дакладзе аб чалавечым развіцці 2016 года Беларусь заняла 52-е месца сярод 188 краін і ўвайшла ў групу краін з даходамі вышэй за сярэднія. Эксперты MAPS прапанавалі чатыры платформы паскарэння рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця. Першая — «зялёны» пераход да інклюзіўнага і ўстойлівага росту. Другая — арыентацыя на будучыя пакаленні. Трэцяя — лічбавыя трансфармацыі і сацыяльныя інавацыі. Чацвёртая — гендарная роўнасць. Калі наша краіна будзе звяртаць больш увагі на гэтыя пункты, будзе лягчэй дасягнуць комплексу ўзаемазвязаных МУР.

УЗЯЦЬ ТАК, КАБ ПАКІНУЦЬ

Наш дабрабыт не павінен ствараць у будучым праблемы для нашых дзяцей

Мы ўсе жадаем жыць так, каб усяго было ў дастатку. Гэта калі ёсць усё неабходнае і не трэба думаць, чым накарміць сям'ю, што апрануць і на якія грошы купіць лекі ў выпадку хваробы. Канешне, хочацца і большага: вандраваць, атрымліваць асалоду ад твораў мастацтва, займацца спортам або любімым хобі... Гэта магчыма, калі ў краіне паспяхова працуе эканоміка — забяспечаны яе рост.

Але эканамічны рост патрабуе рэсурсаў: чалавечых і іншых, самых розных. І тут важна не паўтарыць лёс пасляваеннага пакалення, якое аказалася цалкам выпрацаваным па дасягненні пенсійнага ўзросту. І не дапусціць пагаршэння экалогіі з-за высечкі лясоў дзеля атрымання валюты. Бо тады не будзе здароўя, каб дастаткова доўга і якасна працаваць і развіваць эканоміку краіны далей.

Вось чаму эканоміка — ключавы кампанент усёй сістэмы ўстойлівага развіцця, дзе выкарыстанне рэсурсаў павінна быць максімальна збалансаваным і мэтазгодным. Пра тое, як гэтага дасягнуць, ішла размова на першай сесіі Нацыянальнага форуму па ўстойлівым развіцці.

Не памыліцца ў выбары

Асноўны інструмент забеспячэння такога эканамічнага росту, які не ператворыцца ў праблемы для будучых пакаленняў, — Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця. Летась была распачата карэкціроўка дзеючай версіі — гэта будзе ўжо пятая Нацыянальная стратэгія ў гісторыі сучаснай Беларусі. Яна складаецца на новы тэрмін — да 2035 года.

«Для таго каб якасна яе распрацаваць, мы стварылі грамадскі савет, у які ўвайшлі 30 найлепшых экспертаў з самых розных галін навукі, адукацыі, з міжнародных арганізацый, бізнесу, грамадзянскай супольнасці, — расказаў **мадэратар секцыі міністр эканомікі Беларусі Дзмітрый КРУТОЙ.** — Летась было праведзена сем круглых сталоў, мы шырока абмяркоўвалі новыя прыярытэты і задачы Мэт устойлівага развіцця. Вострая дыскусія разгарнулася па прыярытэтах навукова-тэхналагічнага прагрэсу і пры абмеркаванні тэмы рэгіянальнай палітыкі».

У канцэпцыі Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця абазначаны пяць прыярытэтаў. Першы: стварэнне годных рабочых месцаў, якія забяспечваюць роўныя магчымасці ў любым узросце. Другі: лічбавізацыя краіны, паўсюднае ўкараненне інавацый і якасная адукацыя. Трэці: устойлівае развіццё інстытута сям'і, патэнцыялу дзяцей і моладзі. Чацвёрты: стварэнне ўстойлівай інфраструктуры, камфортнага і канкурэнтаздольнага бізнес-асяроддзя. Пяты: гарантаванне экалагічнай бяспекі на аснове развіцця «зялёнай» эканомікі, рацыянальных мадэляў вытворчасці і спажывання.

«Працягваецца дыскусія наконт шостага прыярытэту — рэгіянальнага развіцця, — дадаў Дзмітрый Крутой. — Пакуль, канешне, гэта вельмі сыры дакумент. Галоўная асаблівасць новай стратэгіі ў тым, што мы ўжо на сто працэнтаў спалучаем яе з глабальнымі Мэтамі ўстойлівага развіцця». Дзеючая стратэгія спалучаецца з глабальнымі мэтамі толькі на 75 %.

Што дапаможа

Сусветны эканамічны крызіс 2008—2009 гадоў прымусіў усе краіны ўносіць карэкціроўкі ў сваё развіццё. Наша не стала выключэннем.

«У Беларусі з 2010 года распачынаюцца асаблівыя намаганні па мадэрнізацыі сваёй прамысловасці ва ўмовах захавання доступу да расійскай эканамічнай прасторы, — адзначыў у сваім дакладзе **Юрый ШАЎЦОЎ, дырэктар Цэнтра па праблемах еўрапейскай інтэграцыі.** — Асабліва важная паспяховая рэалізацыя праекта будаўніцтва Беларускай атамнай электрастанцыі. Гэта самы буйны інвестыцыйны праект на тэрыторыі Беларусі, які паўплывае на ўсю эканоміку краіны: закладзе аснову для ўласнай атамнай прамысловасці і з'явіцца стымулам для развіцця электратэхнічнай індустрыі».

Важным новым элементам мадэрнізацыі Беларусі з'яўляецца хуткае развіццё IT-сектара. Вядучая структура гэтай галіны — Парк высокіх тэхналогій — штогод забяспечвае 20—40-працэнтны рост свайго экспарту. Калі тэмп росту захаваецца, то за 5—10 гадоў IT-экспарт можа вырасці да пяці і больш мільярдаў доларaў у год, што дазволіць у значнай ступені пазбегнуць уразлівасці айчыннай эканомікі.

«Асаблівае значэнне мае тое, што IT-сектар працуе пераважна на рынкі ЗША і Еўрапейскага саюза. Праз гэта Беларусь аказваецца ўцягнутая ў развіццё вельмі магутных глабальных гульцоў», — лічыць эксперт.

Трэцяй рухальнай сілай павінен стаць Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень». Аддача, якая чакаецца, — 50 мільярдаў доларaў экспарту на працягу 10—15 гадоў. «Для Беларусі праект з'яўляецца стратэгічна важным пунктам уваходу ў эканоміку КНР, якая хутка развіваецца», — дадаў Юрый Шаўцоў.

Найбольш маштабным транзітным праектам на шляху паміж ЕС і Кітаем можа стаць рэалізацыя ідэі будаўніцтва высакаскараснай груза-пасажырскай чыгункі з Германіі ў КНР праз Польшчу, Беларусь, Расію і Казахстан. «У выпадку поспеху інвестыцыі ў транспартную інфраструктуру на тэрыторыі нашай краіны могуць перавысіць па сваім аб'ёме інвестыцыі ў будаўніцтва БелАЭС», — лічыць эксперт.

У якасці дадатковага драйвера для тэхналагічнага развіцця беларускай прамысловасці ён назваў развіты ваенна-прамысловы комплекс і мадэрнізацыю транспартных артэрый на тэрыторыі Літвы, Латвіі і Усходняй Польшчы. Апошняе ў хуткім часе значна палепшыць умовы для транспартных зносін паміж Беларуссю і марскімі партамі прыбалтыйскіх краін.

стар. 14

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

МЭТЫ — У ДЗЕЯННІ

Будаўнічы матэрыял для будучыні

Лясы служаць крыніцай даходу, забяспечваюць чысціню паветра, захоўваюць біяразнастайнасць і ўносяць уклад у змякчэнне наступстваў змены клімату.

— Па шэрагу ключавых паказчыкаў Беларусь уваходзіць у дзясятку лясных дзяржаў Еўропы, — адзначыў **першы намеснік міністра лясной гаспадаркі, член Савета па ўстойлівым развіцці Валянцін ШАТРАЎКА.** — З 1994 года лясістасць тэрыторыі рэспублікі вырасла і дасягнула 39,8 %, агульны запас драўніны на пні павялічыўся больш чым на 700 мільёнаў «квадратаў» і склаў каля 1,8 мільярда метраў квадратных. Рацыянальнае выкарыстанне лясных рэсурсаў дазваляе забяспечваць патрэбу ў драўніне без адмоўных наступстваў для навакольля.

У нашай краіне на заканадаўчым узроўні замацаваны прыярытэт узнаўлення лясоў над лесакарыстаннем. Праца лесаводаў скіравана і на стварэнне ўстойлівых лясных насаджэнняў, змяшаных па пародным складзе, а таксама на паступовае павелічэнне натуральнага ўзнаўлення лясоў.

Да 2030 года лясістасць у краіне павінна вырасці мінімум да 41 %, доля змяшаных насаджэнняў — да 74 %, натуральнага ўзнаўлення — да 47 %.

СПАЖЫВАЦЬ, АЛЕ НЕ ЗЛОЎЖЫВАЦЬ

Як нашы звычкі змяняюць свет

— Мэта 12 «Устойлівая вытворчасць і спажыванне» — адна з найбольш складаных і аб'ёмных, — лічыць **дырэктар установы «Цэнтр экалагічных рашэнняў», каардынатар партнёрскай групы ўстойлівага развіцця па экалогіі Яўген ЛАБАНАЎ**. — Але яна і найбольш блізкая да людзей, бо гаворыць пра нашы спажывецкія звычкі.

Апытанне, праведзенае ў 2017 годзе, паказала: 43 % жыхароў Беларусі аддаюць перавагу бутэляванай вадзе. Гэта прыклад таго, як за 15 гадоў змяніліся звычкі людзей. І яны прынеслі не толькі станоўчыя вынікі (паляпшэнне якасці вады), але і адмоўныя (рост колькасці адходаў).

Сёння жыхары планеты сутыкаюцца са многімі выклікамі, якія датычацца ўстойлівай вытворчасці і спажывання. Расце колькасць аднаразовых тавараў, у тым ліку тых, што не перапрацоўваюцца, і вытворчасць пластыку, выкарыстоўваецца вялікая колькасць хімічных рэчываў.

Многія тавары маюць кароткі тэрмін жыцця і хутка становяцца адходамі. Вырашыць праблему дапаможа праца па прадухіленні іх утварэння. Так, у Еўрапейскім саюзе плануецца прыняць дырэктыву, якая абмяжуе выкарыстанне найбольш папулярных пластыкавых аднаразовых тавараў. Канкрэтны план дзеянняў у гэтым кірунку павінен распрацоўвацца і ў нас, упэўнены Яўген Лабанаў. Неабходна стымуляваць вытворцаў і пастаўшчыкоў, каб такія тавары як мага больш павольна траплялі на рынак.

АДКАЗНЫЯ ЗА ВАДУ

Што рабіць, каб брудныя сцёкі не трапілі ў мора

— Рацыянальнае выкарыстанне водных рэсурсаў — прыярытэтная задача УП «Мінскводаканал», — адзначыў **дырэктар прадпрыемства Алег АЎРУЦІН.** — Акрамя павышэння паўторнага выкарыстання вады, сёння важна пазбягаць страты і ў размеркавальнай сетцы, выключаць выпадкі безадказнага спажывання вады.

Нягледзячы на тое што ў Беларусі няма прамога выхаду да мора, праз рэкі наша краіна таксама ўплывае на стан марскіх экасістэм. Таму, па словах Алега Аўруціна, неабходна ўкладаць сродкі ў сістэмы ачысткі сцёкавых вод.

У сталіцы асаблівую заклапочанасць выклікае забруджванне ракі Свіслач. Прычын некалькі, і яны звязаныя як з уласцівасцямі вадацёку, так і з асаблівасцямі работы Мінскай ачышчальнай станцыі — самага буйнога комплексу краіны па ачыстцы сцёкавых вод. Каб знізіць нагрузку на раку, патрабуецца комплексная рэканструкцыя станцыі. Гэта дазволіць і зменшыць аб'ём выкідаў, якія абумоўліваюць непрыемныя пахі, а значыць, палепшыць якасць жыцця насельніцтва такіх сталічных мікрараёнаў, як Шабаны і Чыжоўка.

ШТО ПАТРЭБНА ЭКАФЕРМЕРУ?

Арганічная сельская гаспадарка — адзін з прыкладаў устойлівага развіцця бізнесу экалагічнай скіраванасці.

Руху па папулярызацыі арганічнай сельскай гаспадаркі ўжо больш за стагоддзе, але актыўна развівацца ён пачаў толькі ў апошнія 20 гадоў. Сёння сусветны арганічны рынак складае каля 100 мільярдаў еўра, і з кожным годам аб'ём спажывання арганічнай прадукцыі павялічваецца, у тым ліку і ў Беларусі.

— Зразумела, што хутка з інтэнсіўнай да арганічнай гаспадаркі перабудавацца немагчыма, — адзначае **намеснік кіраўніка сялянска-фермерскай гаспадаркі «СідСад» Алена СІДАРАВА.** — У пераходны перыяд падае ўраджайнасць, пераглядаецца відавы склад культур, неабходна ўпісацца ў мясцовую экасістэму. Арганічная сельская гаспадарка — затратная галіна, але выгадная і перспектыўная.

Фермер упэўненая, што трэба ўмацоўваць рынак экатавараў. І прыняцце закона «Аб вытворчасці і абароце арганічнай прадукцыі» — толькі першы крок да гэтага. Неабходна таксама зацвердзіць стандарты, якія адпавядаюць міжнародным патрабаванням, распрацаваць сістэму льгот для фермераў, спрасціць некаторыя працэдуры, рыхтаваць спецыялістаў і праводзіць навуковыя даследаванні ў гэтай галіне, пашыраць інфармаванасць як фермераў, так і грамадскасці.

РУХАЕМСЯ НАПЕРАД

«Зялёная» чацвёрка і чалавек

Якая дзейнасць у галіне экалогіі павінна стаць прыярытэтнай?

Тэхнічны прагрэс шмат у чым палегчыў жыццё людзей. Але ў многіх дасягненняў ёсць і адваротны бок — экалагічныя праблемы. Як адказваць на гэтыя глабальныя выклікі і ці ёсць магчымасць для «зялёнага» развіцця ў такіх умовах?

Спецыялісты ўпэўнены — развівацца можна. Але пры гэтым неабходна аб'яднаць эканамічны, сацыяльны і экалагічны кампаненты. На гэта скіраваная і Нацыянальная стратэгія ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на перыяд да 2030 года, такія ж прынцыпы знайшлі сваё ўвасабленне і ў нарматыўна-прававых дакументах, якія прымаліся ў краіне ў апошнія гады.

— Устанаўленне партнёрскіх сувязяў дзяржавы, грамадства і бізнесу гарантуе забеспячэнне сацыяльнай стабільнасці, экалагічнай бяспекі і эканамічнай эфектыўнасці, — расказала **першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Ія МАЛКІНА.** — І ў гэтым працэсе вялікую ролю адыгрываюць парламентарыі, якія таксама забяспечваюць рэалізацыю Стратэгіі.

ТОЛЬКІ ЛІЧБЫ

— Беларусь займае **44-е** месца са 180 краін па Індэксе экалагічнай эфектыўнасці.

— Сёння ў свеце выкарыстоўваецца каля **170 тысяч** розных хімічных рэчываў. Велічыня іх уздзеяння на навакольле і чалавека вядомая толькі для часткі з іх.

— Перавесці ўсіх спажыўцоў Мінска на водазабеспячэнне пітной вадой з падземных крыніц плануецца да **2025** года.

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Падчас работы форуму.

Па словах Іі Малкінай, неабходна забяспечыць зацікаўленасць органаў дзяржкіравання ў экалагізацыі прыярытэтных для краіны галін эканомікі. І асноўны акцэнт трэба зрабіць на ўсведамленні: неабходна ўбудоўваць экалагічныя паказчыкі ў паказчыкі эфектыўнасці асобнага бізнесу ці цэлых галін, бо «хто не прыме гэта да выканання сёння, той прайграе».

Эксперты вылучаюць чатыры стратэгічныя «зялёныя» прыярытэты, якія павінны легчы ў аснову дзяржаўнай палітыкі:

*** Узаемадзеянне дзяржавы, грамадства і бізнесу па змякчэнні наступстваў змены клімату і адаптацыі да іх.**

Згодна з Парыжскім кліматычным пагадненнем Беларусь абавязалася скараціць выкіды парніковых газаў — да 2030 года яны не павінны перавышаць 74 мільёнаў тон у эквіваленце CO_2. Сёння ж паказчык знаходзіцца на ўзроўні 91,5 мільёна тон, а значыць, што за 11 гадоў неабходна зменшыць выкіды на 17,5 мільёна. Гэта глабальны выклік для такіх галін, як энергетыка, транспарт, сельская гаспадарка.

Дапамогуць на яго адказаць укараненне нізкавугляродных і безвугляродных тэхналогій у галіне электратранспарту, ацяплення жыллёвага фонду, парытэтнае развіццё як атамнай энергетыкі, так і ўзнаўляльных крыніц энергіі.

*** Аб'яднанне дзяржаўных і рэгіянальных органаў кіравання, перш за ўсё мясцовых Саветаў дэпутатаў, прыватнага сектара з міжнароднымі партнёрамі для рэалізацыі канцэпцыі «ўстойлівых» гарадоў.**

Сёння ў нашай краіне каля 75 % насельніцтва — гарадскія жыхары, а ў 2030 годзе іх колькасць узрасце да 80 %. Задачы па фарміраванні сацыяльнай інфраструктуры, забеспячэнні занятасці гарадскога насельніцтва немагчыма вырашыць без пашырэння вытворчасцяў. Пры гэтым гарады павінны заставацца экалагічна бяспечнымі.

10.15, 4.30 «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
12.00, 17.45 «Варажбітка» (12+).
13.10, 16.35 «Містычныя гісторыі» (12+).
14.10 «Адкрыта» з Аксанай Байрак» (16+).
15.05 «Простыя складанасці» (12+).
15.40 «Натуральны адбор» (12+).
19.00, 2.45 «Тры ў адным-2». Серыял (12+).
21.10 «Савецкія мафіі» (16+).
22.00 «Знак якасці» (16+).
23.20 «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
0.05 «Аўстралія». Драма (12+).

ТБ1000

8.10 Лепш не бывае (12+).
10.45 Змрочныя цені (16+).
13.00 Прадчуванне (16+).
14.55 Эд з тэлевізара (12+).
17.20 Код да Вінчы (16+).
20.10 Жонка падарожніка ў часе (16+).
22.20 Трывожны выклік (16+).
0.15 Моладзь (16+).
2.15 Берлінскі сіндром (18+).
4.10 Маёмасць з хвастом (12+).

ТБ1000 Рускае кіно

6.20 Цёмны свет: раўнавага (12+).
8.20 Дзеткі напракат (12+).
10.10 Бабло (16+).
12.00 Уцёкі (16+).
14.25 Тайна чатырох прынцэс (0+).
16.20, 4.35 З Сібіры з каханнем. 1—2-я серыі (12+).
18.15 Самы лепшы дзень (16+).
20.20 Цяжка быць мача (16+).
22.25 Клушы (16+).
0.30 Каменная башка (16+).
2.20 Старыя клячы (16+).

National Geographic

0.30 Экстрэмальны Кітай (16+).
1.10, 4.20, 9.40 Дзікі тунец (16+).
2.00, 15.55, 23.45 Гарачыя граніцы (16+).
2.50, 16.40, 21.20 Расследаванні авіякатастроф (16+).
3.35 Эвакуацыя Зямлі (16+).
5.10 Супербудаванні (16+).
6.00 Самыя дзіўныя фатаграфіі National Geographic (16+).
6.30 Шлях абуджэння (16+).
8.10, 14.20 Аўта-SOS (16+).
10.30 Гульні розуму (16+).
11.20 Сутыкненне кантынентаў (16+).
12.05 Шаша праз пекла (16+).
12.50 Каралі шахт (16+).
13.35, 20.35 Экстрэмальны Кітай (16+).
19.45 Секунды да катастрофы (16+).
23.00 Ліхтугі за мяжой (16+).

Discovery

8.00, 16.00, 22.00, 3.50 Махінатары.
9.00, 17.00, 23.00, 4.40 Аўтамайстэрні.
10.00, 15.00, 21.00 Як гэта зроблена?
11.00, 20.00, 5.30 Бітва за нерухомасць.
12.00 Не спрабуйце паўтарыць.
13.00 Цікава пра ўсё.
14.00, 3.50 Скрозь кратовую нару.
18.00 Забойныя дылемы.
19.00 Рэальныя дальнабойшчыкі.
0.00 Залатая ліхаманка.
1.00, 6.20 Баявыя машыны.
2.00, 7.10 Чаму?
2.55 Мадэль для зборкі.

ПЫТАННІ ГЕНДАРУ, АКТЫЎНАГА ДАЎГАЛЕЦЦЯ І ЗДАРОЎЯ

З якімі сацыяльнымі праблемамі сутыкаецца наша краіна?

Працягласць жыцця становіцца большай, але вядзе да старэння насельніцтва. І гэта характэрна не толькі для нашай краіны. Прагназуецца, што ў 2030 годзе мы дасягнём сярэдняй працягласці жыцця ў 78,7 года. Плюсы і мінусы такой сусветнай тэндэнцыі абмеркавалі на сесіі «Паляпшэнне якасці жыцця праз здароўе, запатрабаваную адукацыю, дастойную працу». На ёй закранулі і іншыя сацыяльныя пытанні.

Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі, кіраўнік міжведамаснай рабочай групы па сацыяльных пытаннях Савета па ўстойлівым развіцці Валерый КАВАЛЬКОЎ звярнуў увагу на канцэпцыю Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця да 2035 года. У ёй абазначана, што асноўныя намаганні ўрада будуць засяроджаны на стварэнні ўмоў для прадукцыйнай занятасці, якая дастойна аплачваецца, забеспячэнні ўстойлівага росту даходаў насельніцтва і годнай старасці, развітой сістэмы сацыяльнай абароны ўразлівых катэгорый грамадзян.

У Беларусі добрыя стартавыя пазіцыі, адзначае намеснік міністра, у трэцім квартале 2018 года толькі 5,6 % насельніцтва афіцыйна адносіліся да катэгорыі малазабяспечаных. Гэты паказчык удвая ніжэйшы за сярэдні па краінах СНД і Усходняй Еўропы.

Сур'ёзныя вынікі былі дасягнуты па недапушчэнні неабгрунтаванай дыферэнцыяцыі даходаў насельніцтва. З 2000 года дыферэнцыяцыя захоўваецца на невысокім узроўні. Індэкс канцэнтрацыі даходаў за апошнія 17 гадоў знізіўся з 0,31 да 0,27.

Стварэнне высокапрадукцыйных рабочых месцаў наўпрост звязана з індустрыялізацыяй рэгіёнаў, асваеннем новых вытворчасцяў. Пунктамі росту з'яўляюцца сфера IT-паслуг, фінансавая і навукова-прафесійная дзейнасць. Па словах намесніка міністра, асаблівая роля будзе адводзіцца такім формам занятасці, як малое і сярэдняе прадпрымальніцтва, сямейны бізнес, самазанятасць насельніцтва. Іх развіццё будзе садзейнічаць спрашчэнню доступу да фінансавых паслуг, лічыць Валерый Кавалькоў.

Міністр працы і сацыяльнай абароны Беларусі Ірына КАСЦЕВІЧ падкрэсліла, што пытанні сацыяльнай справядлівасці «залатой ніткай» праходзяць праз Парадак-2030. Але яна звярнула ўвагу на тое, што, на жаль, назіраецца рост колькасці грамадзян з інваліднасцю. І гэта выклік для нашай краіны. Плюс сёння ва ўсім свеце, і ў Беларусі таксама, назіраецца старэнне насельніцтва. Каля 15 % — гэта грамадзяне, старэйшыя за 65 гадоў. Прагноз да 2020 года паказвае, што гэта катэгорыя павялічыцца да 20 %. Гэта таксама выклік. Ірына Касцевіч расказала, што ўжо ідзе распрацоўка Нацыянальнай стратэгіі актыўнага даўгалецця, дзе будуць абазначаны асноўныя напрамкі: спорт, здароўе, адукацыя, культура. Тэму пра актыўную старасць



працягнула **загадчыца аддзела развіцця інавацыйных формаў сацыяльнага абслугоўвання Навукова-даследчага інстытута працы Мінпрацы Наталля МІЛЬКОТА.**

Па класіфікацыі ААН, насельніцтва з'яўляецца старым, калі пажылых больш за 7 %. Беларусь гэты парог ужо перавысіла ў два разы, а хутка пераскочыць нават і ў тры. На рэгіянальным узроўні сітуацыя нават выразнейшая. Напрыклад, у Зэльвенскім раёне Гродзенскай вобласці ўдзельная вага насельніцтва, старэйшага за працаздольны ўзрост, на пачатак 2018 года складала 38,1 %, у Свіслацкім — 37,2 %. Калі паглядзець на асобныя населеныя пункты, то ў гарадскім пасёлку Азярышча Гарадоцкага раёна, напрыклад, гэта лічба ўжо на ўзроўні 44,7 %. Старэнне ў сельскай мясцовасці пачалося раней і ідзе хутчэй. У многіх сельскіх рэгіёнах

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

удзельная вага людзей старэйшага ўзросту складае больш за 40 %, звяртае ўвагу эксперт. Гэтыя тэрыторыі могуць жыць і развівацца, быць устойлівымі толькі ў той сітуацыі, калі патэнцыял пажылых людзей будзе выкарыстоўвацца па-іншаму.

Змяняецца само ўспрыманне пажылога чалавека. Агульны акцэнт у канцэпцыях актыўнага даўгалецця і здаровага старэння зроблены на патэнцыяле пажылых людзей. Новае бачанне паказвае адначасова і ўразлівасць, патрэбу сацыяльнай абароны, і вялікія, часта недаацэненыя магчымасці. Гэта наўпрост суадносіцца з МУР.

Рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Вадзім БОГУШ лічыць, што шмат у чым дасягненне Мэт устойлівага развіцця залежыць ад таго, як будзе працаваць сістэма адукацыі. Ён адзначае, што МУР пранікліў змест адукацыйных праграм на ўсіх узроўнях. Пачынаючы ад дашкольнай адукацыі, дзе вучаць рацыянальна выкарыстоўваць рэсурсы, і заканчваючы спецыялізаванымі навуковымі даследаваннямі ў ВНУ.

На думку Вадзіма Богуша, вышэйшая школа ў сучасных умовах атрымлівае дадатковыя задачы, звязаныя не толькі з навуковым і інавацыйным развіццём, але і з пэўным сацыяльным абавязкам. Неабходна фарміраваць так званыя кампетэнцыі XXI стагоддзя: крэатыўнасць, крытычнае мысленне, камунікатыўнасць. Будучаму супрацоўніку трэба быць інфармацыйна адукаваным і валодаць інфармацыйна-камунікацыйнымі тэхналогіямі. Менавіта таму летась былі распрацаваны асноўныя напрамкі ўдасканалення адукацыі ў IKT-сферы, каментуе рэктар БДУІРа.

Намеснік міністра аховы здароўя — галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Беларусі, член Савета па ўстойлівым развіцці Наталля ЖУКАВА звярнула ўвагу на дэмаграфію. У нашай краіне адзначаецца зніжэнне смяротнасці, а таксама колькасці хворых на розныя інфекцыі. Сістэма вакцынацыі дазваляе захоўваць здароўе і дабрабыт насельніцтва. Разам з тым застаюцца некаторыя пагрозы і рызыкі, на якія варта звярнуць дадатковую ўвагу. Напрыклад, ВІЧ-інфіцыраваныя.

Пытанні гендару закранула выконваючая абавязкі **кіраўніка офіса Фонда ААН у галіне народанасельніцтва (ЮНФПА) у Беларусі Гульнара КАДЫРКУЛАВА**. Яна лічыць, што намаганні па дасягненні гендарнай роўнасці (Мэта № 5) паўплываюць і на дасягненні іншых паказчыкаў устойлівага развіцця, як, напрыклад, паменшэнне эканамічнай і сацыяльна-культурнай няроўнасці.

Беларусь займае высокія пазіцыі ў рэйтынгах гендарнай роўнасці за кошт добрага ўзроўню адукацыі жанчын, занятасці на рынку працы, доступу да паслуг аховы здароўя. Як тлумачыць Гульнара Кадыркулава, гэта садзейнічае таму, што многія жанчыны перш, чым стварыць сям'ю, робяць прафесійную кар'еру, каб быць эканамічна незалежнымі. У той жа час яны працягваюць несці нагрузку, звязаную з выхаваннем дзяцей і доглядам пажылых членаў сям'і. Многія жанчыны рэалізуюць сваё права на адпачынак па доглядзе дзіцяці ў поўным аб'ёме. Але калі яны вяртаюцца на працу, то, як правіла, атрымліваецца, што ў параўнанні са сваімі калегамі-мужчынамі яны страцілі магчымасці кар'ернага росту, на якія маглі разлічваць раней.

Якая роля бізнесу можа быць у вырашэнні сацыяльных пытанняў, расказаў **кіраўнік офіса сеткі Глабальнага дагавора ААН у**



Беларусі, дырэктар фонду «Добра», каардынатар партнёрскай групы ўстойлівага развіцця па ўзаемадзеянні з бізнесам Аляксандр СКРАБОЎСКІ. Ён растлумачыў, што дабрачыннасць — неад'емная частка бізнесу, але гэта толькі элемент, і не самы эфектыўны. Ёсць яшчэ карпаратыўная сацыяльная адказнасць — гэта дадатковы добраахвотны ўклад бізнесу ў развіццё грамадства ці навакольнай тэрыторыі. Часцей за ўсё гэта грошы, але не абавязкова. Рэсурсы ідуць на рэалізацыю праектаў, карысных для грамадства, і наўпрост ніяк не звязаныя з дзейнасцю кампаніі.

Існуе яшчэ адзін варыянт, калі бізнес разумее, што гэты сацыяльны праект лепш рэалізоўваць па бізнес-механіцы, працягваць на ім зарабляць грошы. І менавіта гэта забяспечыць устойлівасць праекта і не будзе патрабаваць у далейшым пошуку дадатковых фінансавых рэсурсаў.

У гэтым разе сацыяльнае прадпрымальніцтва не з'яўляецца панацэяй — гэта толькі яшчэ адзін інструмент. На думку Аляксандра Скрабоўскага, гэта трэба ўлічваць пры распрацоўцы законапраектаў. Неабходна ў цэлым выбудоўваць сістэму, калі бізнесу будзе зручна працаваць з сацыяльнымі праблемамі.

Дырэктар фонду прывёў прыклад праекта «ТатаЗАЛ». Ён накіраваны на тое, каб таты больш часу праводзілі з дзецьмі ў спартыўных залах. Зараз ён ахоплівае каля дзясятка школ па Беларусі і нават некалькі за межамі краіны. Першапачаткова бізнес падтрымаў ідэю на тры залы, а аўтары праекта на гэтыя грошы зрабілі восем. Да таго ж таты, якія прыходзяць туды з дзецьмі, часта самі з'яўляюцца бізнесменамі, таму могуць ужо ад імя сваёй кампаніі адкрыць новы зал пад гэты праект ці асабіста падтрымаць далейшае развіццё. Аляксандр Скрабоўскі адзначае, што гэта ініцыятыва паказвае выдатнае ўзаемадзеянне з мясцовай уладай. Пілотны праект быў запушчаны ў Гомельскай вобласці, далей пайшоў па Беларусі, і мясцовая ўлада дала памяшканні на базе школ. А арэнда — гэта асноўныя выдаткі.

Надзея АНІСОВІЧ.

ГЕАЛАКАЦЫЯ ДЛЯ КРАІНЫ

Кожны зможа ўбачыць, як мы рухаемся да пастаўленых мэт

Каб ведаць, з якой хуткасцю і куды едзе аўтамабіль, патрэбны адпаведныя прыборы і сувязь са спадарожнікамі ў космасе. Тое, як да дасягнення Мэт устойлівага развіцця рухаецца ўвесь свет, можна будзе адсочваць па 232 глабальных паказчыках, якія вызначаны ААН. Ацаніць, з якой хуткасцю па гэтым шляху рухаецца Беларусь, дазволіць адпаведная сістэма маніторынгу. Нацыянальны пералік з 255 паказчыкаў ужо падрыхтаваны, з іх 140 цалкам адпавядаюць глабальным.

Беларускі статыстычны камітэт на першым Нацыянальным форуме па ўстойлівым развіцці прэзентаваў Нацыянальную платформу справаздачнасці па Мэтах устойлівага развіцця. Гэта платформа дазволіць беларускаму ўраду і органам дзяржаўнага кіравання прымаць адпаведныя рашэнні, а міжнароднай супольнасці — зразумець, куды рухаецца Беларусь і як яна дасягае сваіх Мэт устойлівага развіцця, заявіла **старшыня Нацыянальнага статыстычнага камітэта Іна МЯДЗВЕДЗЕВА**.

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Нацыянальная платформа справаздачнасці па МУР запушчана ў канцы мінулага года і размешчана на сайце Белстата. Апроч іншага, платформа дапаможа ўцягнуць у працэс дасягнення МУР грамадзянскую супольнасць, лічыць **намеснік старшыні Белстата Алена КУХАРЭВІЧ.** Карыстальнік зможа камбінаваць розныя паказчыкі і размяшчаць іх у адной табліцы, выбіраць від дыяграмы, геаграфію, мэту, паказчык.

Намеснік старшыні статыстычнага ведамства таксама паведаміла, што платформа дазволіць вырашыць праблему разыходжання ў даных, атрыманых з розных крыніц, з данымі афіцыйнай статыстыкі: «Уся інфармацыя, якая датычыцца маніторынгу Мэт устойлівага развіцця, на глабальны ўзровень будзе даваццца толькі Белстатам».

Сёння на платформе размешчаны 188 паказчыкаў, або 75 % ад тых, якія вызначаны актуальнымі для краіны, а таксама мэтавыя значэнні па 53 паказчыках. Гэта работа працягваецца.

Палову паказчыкаў Нацыянальнай платформы па фарміраванні справаздачнасці па Мэтах устойлівага развіцця дае статыстыка, астатнія — органы дзяржаўнага кіравання. Напрыклад, Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь забяспечвае інфармацыяй асноўныя паказчыкі Мэты 16 «Мір і правасуддзе».

Намеснік міністра ўнутраных спраў — начальнік міліцыі грамадскай бяспекі, член Савета па ўстойлівым развіцці Мікалай МЕЛЬЧАНКА расказаў удзельнікам форуму, як ведамства фарміруе пяць паказчыкаў названай Мэты.

Адна з асноўных крыніц інфармацыі — адзіны дзяржаўны банк даных пра правапарушэнні. Згодна з ёй за апошнія 10 гадоў колькасць ахвяр наўмысных забойстваў у нашай краіне знізілася ўдвая (да 240 у 2017 годзе і яшчэ на 6 % летась). За гэты ж час з 278 да 91 паменшылася і колькасць тых, хто загінуў у выніку гвалту ў сям'і. Найбольш дзейснай мерай у папярэджанні падобных трагедый МУС лічыць ахоўнае прадпісанне і прафілактычны ўлік. У 2018 годзе першае было выкарыстана ў адносінах да амаль сямі тысяч грамадзян, у тым ліку больш за шэсць тысяч былі абавязаны пакінуць агульнае з пацярпелымі жыллё.

Што датычыцца сексуальнага гвалту, то тут рэспубліканскі банк даных сведчыць пра рост. Намеснік міністра тлумачыць, што гэта звязана не столькі з тым, што такіх злачынстваў стала больш, колькі з тым, што раней ахвяры радзей паведамлялі пра такія злачынствы і сапраўдная іх колькасць была ў большай ступені схаваная, чым цяпер.

Беларусі ўдалося дасягнуць зніжэння злачынстваў у сферы гандлю людзьмі, у тым ліку дзякуючы выкананню абавязацельстваў, якія прадугледжаны адпаведнымі міжнароднымі дагаворамі.

Сярод праблем, з якімі сутыкнулася міністэрства пры фарміраванні і маніторынгу паказчыкаў для Мэты 16, Мікалай Мельчанка назваў адсутнасць міжнароднай практыкі, крытэрыяў і метадалогіі для ацэнкі асобных паказчыкаў, цяжкасць адаптацыі міжнароднай метадалогіі да нацыянальных умоў, неабходнасць дадатковых абследаванняў і формаў уліку, якія патрабуюць фінансавых выдаткаў, і адсутнасць у нацыянальным заканадаўстве паняццяў «фізічны гвалт» і «псіхалагічны гвалт».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

УЗЯЦЬ ТАК, КАБ ПАКІНУЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар. «МС».)

«Развіццё па ўказаных кірунках пацягне змяненне эканамічнай геаграфіі Беларусі: значна вырастуць Мінск, Астравец, Гродна і Брэст, — падзяліўся прагнозамі палітолаг. — Чым больш моцнай становіцца эканоміка Беларусі, тым больш выгадна гэта для суседніх краін. Устойлівае развіццё на базе прынятай мадэлі — таксама найважнейшы фактар стрымлівання палітычнай напружанасці ва Усходняй Еўропе».

У найбліжэйшыя 10 гадоў сфарміруюцца ўмовы для таго, каб Беларусь стала ядром развіцця як мінімум для Усходняй Польшчы, Літвы і Латвіі, рэзюмаваў дакладчык.

Дык што такое лічбавізацыя?

На гэта пытанне паспрабаваў адказаць **намеснік дырэктара адміністрацыі Парка высокіх тэхналогій Аляксандр МАРЦІНКЕВІЧ.**

«Гэта працэс аб'ектыўны, непазбежны, і яго спыніць немагчыма, — заявіў ён. — У нас ёсць рэальны свет і віртуальны свет, зараз адбываецца фарміраванне так званага гібрыднага свету, у якім першыя два светы паміж сабой злучаюцца. Эксперты ПВТ лічаць, што лічбавая эканоміка — гэта тая, якая будзе існаваць у гібрыдным свеце».

«Многія не разумеюць розніцы паміж лічбавізацыяй і інфарматызацыяй. Лічбавізацыя — гэта працэс, у выніку якога ствараюцца цалкам новыя прадукты, сэрвісы і цэлыя галіны. Калі мы пачынаем рабіць тое, чаго не рабілі да таго, як была ўкаранёная лічбавізацыя, або адмаўляемся ад таго, што рабілі традыцыйна», — тлумачыў дакладчык удзельнікам форуму.

Лічбавізацыя наступае тады, калі, скажам, кампанія Uber стварае платформу, якая цалкам змяняе ўсе бізнес-працэсы. Калі залішнімі становяцца аператары, а любы чалавек, які мае аўтамабіль, можа прапанаваць сваю паслугу на рынку.

У лічбавай эканоміцы зрушваюцца фокусы: сёння больш каштоўнымі становяцца ўласцівасці тавару, чым сам тавар. Напрыклад, кампанія Rolls-Royce прадае ўжо не рухавікі для самалётаў, а час палёту, а Liebherr прадае не грузавыя краны, а танаж. Калі мы сёння не будзем да гэтага гатовыя, нам не ўдасца пабудаваць канкурэнтаздольную эканоміку, падкрэсліў намеснік дырэктара адміністрацыі ПВТ.

Нарэшце, лічбавая эканоміка вядзе да росту пакупной здольнасці насельніцтва. «Справа ў тым, што сёння праграмнае забеспячэнне смартфона замяняе магнітафон, дыктафон, ліхтарык і шмат чаго яшчэ, — прывёў чарговы прыклад Аляксандр Марцінкеіч. — За кошт таго, што тавары становяцца лічбавыя, іх вельмі лёгка капіяваць, для гэтага не патрэбны матэрыяльныя рэсурсы. Да таго ж праз тое, што рэчаў шмат, змяншаецца іх кошт».

Для нашай краіны лічбавая трансфармацыя з'яўляецца рэальным і ўнікальным шанцам пераарыентаваць эканоміку, забяспечыць яе ўстойлівы рост і павышэнне ўзроўню дабрабыту грамадзян, упэўнены прадстаўнік ПВТ.

«Мы сёння можам не толькі гандляваць сыравінай і таварамі, але і ствараць высокадаходныя інтэлектуальныя сістэмы і паспяхова канкурыраваць з вядучымі сусветнымі кампаніямі на міжнародным рынку», — падкрэсліў ён.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

А ШТО Ў РЭГІЁНАХ?

Старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК:

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

— 28 чэрвеня 2019 года ў Магілёўскай вобласці пройдзе першая рэгіянальная канферэнцыя па дасягненні Мэт устойлівага развіцця. Зараз вызначаны чатыры прыярытэтныя кірункі развіцця рэгіёна. Першае — умацаванне чалавечага патэнцыялу, забеспячэнне роўных магчымасцяў незалежна ад гендарнай прыкметы. Уцягненне ў развіццё рэгіёна ўсіх: бізнес-асяроддзя, грамадскіх аб'яднанняў, насельніцтва і мясцовай улады.

Гэта задача вельмі важная: за 10 гадоў насельніцтва вобласці знізілася на 29 тысяч чалавек. 13 раёнаў вобласці перажываюць наступствы катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, а гэта больш за 690 населеных пунктаў і 104 тысячы чалавек, або амаль 10 % насельніцтва вобласці. Тут мы актыўна выкарыстоўваем такі інструмент, як рэалізацыя мясцовых ініцыятыў пры падтрымцы замежных і міжнародных арганізацый і ўрадаў.

Другі прыярытэт — развіццё высокатэхналагічных і канкурэнтаздольных вытворчасцяў і паслуг, заснаваных на прынцыпах зялёнай эканомікі. Для гэтага актыўна выкарыстоўваецца інвестыцыйны і экспартны патэнцыял свабоднай эканамічнай зоны, прэферэнцыя для стварэння новых прадпрыемстваў у сямі рэгіёнах паўднёвага ўсходу вобласці.

Трэці прыярытэт — удасканаленне бізнес-асяроддзя, арыентаванае на эканоміку інтэлекту, сацыяльныя інавацыі і экалагічную бяспеку для павышэння занятасці і самазанятасці насельніцтва.

Чацвёрты прыярытэт — захаванне добрага навакольнага асяроддзя для забеспячэння найлепшай якасці жыцця для цяперашняга і будучага пакаленняў.

Наступныя крокі — больш шырокае прыцягненне вучоных, бізнесменаў і моладзі ў дасягненне Мэт устойлівага развіцця.

МАЛАДЗЁЖНЫ ФАРМАТ

СУПЕРГЕРОІ ДЛЯ СУПЕРМЭТ

Падчас форуму ўзнагародзілі найлепшых юнакоў і дзяўчат у двух конкурсах. 17 з іх было прысвоена званне «Маладзёжны пасол Мэт устойлівага развіцця». А траіх адзначылі як пераможцаў у конкурсе коміксаў «Супергероі для супермэт».

Каб атрымаць званне пасла, маладыя людзі прайшлі некалькі этапаў. На першым неабходна было абраць адну з МУР, якую яны хочуць прадстаўляць, і апублікаваць свой матывацыйны пост ва «УКантакце», «Фэйсбуку» ці «Інстаграме». Журы ацаніла каля 250 такіх заявак і адабрала ўдзельнікаў фіналу, які прайшоў у студзені. У ім 32 канкурсанты прэзентавалі ўласныя праекты і праграмы па дасягненні адной з МУР. Сярод іх былі ідэі па стварэнні музея экалогіі і тэхнагенных катастроф, павышэнні фінансавай адукаванасці падлеткаў і іншыя.

Конкурс коміксаў «Супергероі для супермэт» праводзіўся летась з 24 верасня да 20 лістапада. Удзельнікам неабходна было прыдумаць свайго супергероя або супергераіню, расказаць, як яны маглі б дапамагчы Беларусі ў дасягненні Мэт устойлівага развіцця. У конкурсе ўдзельнічалі хлопцы і дзяўчаты ад 12 да 22 гадоў.

Трэцяе месца заняла **Рэната СІВАКОВА** з вёскі Паташня Мёрскага раёна, вучаніца Павяцкай яслі-сад — сярэдняй школы. Яна намалявала комікс з Місіс МУР, якая змагаецца з бруднай вадой.

Другая прыступка п'едэстала засталася за **Максімам МАРОЗАВЫМ, студэнтам факультэта мастацтваў і дызайну Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы.** Яго герой — Алесь Журка, у якога ёсць ідэі, як нашай краіне дасягнуць адразу некалькіх Мэт устойлівага развіцця.

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Пераможцай стала **Ганна КАВЕЦКАЯ, вучаніца сталічнай сярэдняй школы № 201.** Яна стварыла МУРавіка — гэта дух Беларусі, які сцеражэ прыроду. Ён вучыць дзяцей ачышчаць ваду, берагчы рэсурсы, разам вырашаць праблемы экалогіі, піша кнігі пра беларускую прыроду. МУРавік знаходзіць новыя, бяспечныя для навакольнага асяроддзя крыніцы энергіі. А дапамагаюць яму духі прыроды.

Надзея АНІСОВІЧ.

РАЗМОВА ПА СУТНАСЦІ

Дарогі, дзіцячыя садкі, школы і паліклінікі...

Мэр Гродна расказаў, чым павінны займацца гарадскія ўлады

На мінулым тыдні старшыня гарвыканкама сустрэўся з гараджанамі ў самым маладым і праблемным мікрараёне горада — Альшанцы. Падчас размовы ён расказаў аб перспектывах развіцця горада на найбліжэйшы час: калі з'явіцца анкадыспансер, чаго чакаць бязвізавым турыстам і калі завершыцца першая чарга рэканструкцыі Старога замка, ці будуць у Гродне другая кальцавая магістраль і могілкі для хатніх жывёл, а таксама аб праекце Андрэя Разіна «Сонечнае кола».

ГОРАД РАСЦЕ

На сустрэчу, што адбылася ў школе № 39, разам з мэрам прыйшлі кіраўнік адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Алег Бялінскі і дырэктар упраўлення капітальнага будаўніцтва гарвыканкама, дэпутат абласнога Савета Анатоль Урублеўскі, а таксама кіраўнікі профільных упраўленняў гарвыканкама.

— Вы павінны ведаць з афіцыйных крыніц, што робіцца ў горадзе, і атрымаць з першых вуснаў адказы на свае пытанні, — распачаў **мэр горада Мечыслаў ГОЙ.**

Як паведаміў галоўны архітэктар Гродна Дзмітрый Вабішчэвіч, падрыхтаваны генплан развіцця абласнога цэнтра да 2030 года, які прайшоў грамадскае абмеркаванне і ў хуткім часе будзе разглядацца кіраўніком дзяржавы. Згодна з дакументам колькасць гараджан за 10 гадоў павялічыцца да 395 тысяч, а праз 20 — да 405 тысяч чалавек. Штогод гарадскія ўлады плануюць будаваць 170—180 тысяч жылых «квадратаў». Галоўным чынам актыўнае будаўніцтва будзе ісці ў мікрараёнах Грандзічы і Баранавічы, а што датычыцца Альшанкі, пакуль тэмпы ўводу жылля тут запаволяцца. Прычын некалькі, галоўныя з якіх — магутнасці па ацяпленні і каналізаванні ўжо дасягаюць свайго парога.

А між іншым ёсць адставанне развіцця інфраструктуры ад росту колькасці высотак і, адпаведна, насельніцтва. На дадзеным этапе тут ужо жыве каля 30 тысяч чалавек, а ў перспектыве навасёламі ў мікрараёне будуць лічыцца 50 тысяч. Людзей хвалюе не толькі тое, дзе жыць, але і дзе купляць ежу, як трапіць дзіцяці ў садок ці школу побач з домам, наведаць урача ў сваім раёне, нарэшце, адпачыць з сям'ёй тут жа. Па звестках аддзела адукацыі гарвыканкама, на сённяшні момант амаль 1500 малых з гэтага раёна маюць патрэбу ў наведванні садка, а гэта значыць, што разам з дзіцячымі ўстановамі, якія тут існуюць, яшчэ неабходна пабудаваць некалькі новых... Дарэчы, як і яшчэ адну школу, што павінна адчыніць свае дзверы 1 верасня.

— Нельга паўтараць памылку, таму далейшае будаўніцтва жылля будзе весціся ў паўночным кірунку і ў мікрараёнах, дзе ўжо ёсць неабходная інфраструктура, — падкрэсліў кіраўнік горада.

Разам з тым у Альшанцы сёлета запланавана ўвесці другую дзіцячую амбулаторыю, распачаць будаўніцтва паліклінікі і, згодна з абяцаннем жыхарам мікрараёна, штогод будаваць па адным дзіцячым садку.

І яшчэ адзін галоўны аб'ект, будаўніцтва якога неабходна гораду, — анкадыспансер. Дарэчы, Гродна — адзіны абласны цэнтр у краіне, дзе няма такой клінікі.

Як паведаміў Мечыслаў Гой, пад гэтыя мэты запланавана рэканструкцыя 3-й гарадской паліклінікі і накіравана 200 мільёнаў рублёў, ільвіная доля грошай пойдзе на закупку неабходнага абсталявання. У лютым павінна ўжо быць гатовая экспертыза праекта.

ДРУГОЕ КАЛЬЦО

Разам з ростам горада расце і аўтапарк гараджан. Як прадугледжвалася генпланам, распрацаваным у 2003 годзе, летась на тысячу жыхароў павінна было быць 350 жалезных «коней». Аднак жа рэальнасць аказалася іншай: 470 аўтамабіляў прыйшлося ў 2018-м на тысячу гараджан. Да таго ж тут не ўліченыя транзітны паток і замежныя грузы. Як вынік — развіццё дарожнай сеткі таксама не адпавядае сённяшнім рэаліям.

Па словах Мечыслава Гоя, ужо ў красавіку распачнецца першая чарга рэканструкцыі старога чыгуначнага моста цераз Нёман пад аўтамабільны, які звяжа вуліцы Паўднёвую з Кляцкова з выездам на аўтамагістраль М6. У будучыні гэта стане адным з участкаў другой кальцавой гарадской магістралі, у якой ёсць патрэба. Існуюць планы і па рэканструкцыі вуліцы Каліноўскага са зносам прыватнай забудовы і выпраўленнем дарогі.

Шмат пытанняў гараджане задавалі наконт стану пляцовак для выгулу сабак, наогул культуры ўтрымання хатніх жывёл і стасункаў з суседзямі адносна балючай тэмы «неспадзяваных» кучак. Так, праблема з выгулам існуе, пагаджаецца кіраўніцтва горада, таму камунальнай службе даручана вывучыць стан пляцовак і прыняць адпаведныя захады па яе вырашэнні. А яшчэ ёсць другая праблема, звязаная з хатнімі любімцамі: у Гродне няма могілак для пахавання чатырохногіх сяброў.

— Гэтую праблему мы таксама вырашым, — паабяцаў гараджанам мэр.

ПАДАРУНАК ДА ФЕСТЫВАЛЮ

Два гады Гродна працуе ў бязвізавым фармаце. Што гэта дае гораду і як заахвоціць замежнікаў часцей да нас прыязджаць? Гэтыя пытанні таксама гучалі на сустрэчы.

Як адзначыў старшыня гарвыканкама, толькі летась абласны цэнтр наведала каля ста тысяч турыстаў з 70 краін свету. Між іншым, тут не ўлічаны госці, што наведваюць Беларусь свабодна, без перасячэння мяжы, напрыклад, расіяне, якія вельмі любяць адпачываць у беларускіх санаторыях і аграсядзібах.

— Мы імкнёмся, каб горад набываў свае цікавінкі і да нас імкнуліся госці: дзякуючы гэтаму з'яўляюцца новыя кафэ, гатэлі, хостэлы (нават капсульнага тыпу)... Але гэтыя віды бізнесу — прыватныя. Гарадская ж улада павінна займацца дзіцячымі садкамі, школамі, паліклінікамі, дарогамі, — падкрэсліў Мечыслаў Гой.

Цікавіць, безумоўна, гасцей і гісторыя. Не засталося падчас сустрэчы па-за кадрам і пытанне рэканструкцыі Старога замка. Як паведаміў мэр Гродна, першая чарга рэканструкцыі гэтага важнага аб'екта павінна завяршыцца да наступнага рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур, што адбудзецца ў 2020-м.

Ёсць намер прывесці ў належны стан і стэлу ў Каложскім парку па праграме трансгранічнага супрацоўніцтва.

Наогул, дзве гадзіны прабеглі ў адказах на шматлікія пытанні як некалькі хвілін... Зразумела, што не ўсе знайшлі сваё адлюстраванне з-за абмежаванага фармату ў газетным артыкуле, і, каб закончыць на аптымістычнай ноце, згадаю яшчэ адзін адказ, які датычыўся развіцця талентаў у дзяцей і падлеткаў.

Па словах Мечыслава Гоя, падчас нядаўняга візіту ў Гродна вядомага выканаўцы «Ласкавага мая» Андрэя Разіна апошні выказаў намер стварыць дзіцячы творчы цэнтр пад эгідай праекта «Сонечнае кола» — школу для дзяцей-сірот і таленавітай моладзі, каб тыя мелі магчымасць займацца эстраднай музыкай.

Вольга АНУФРЫЕВА,
дэпутат Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў па Паўднёвай выбарчай акрузе № 22.

Дайсці трэба да кожнага

Дэпутаты розных узроўняў у сераду, 30 студзеня, абмеркавалі ў Віцебску актуальныя тэмы, якія датычацца кожнага жыхара Прыдзвінскага краю

Абласны семінар «Аб рабоце органаў мясцовага кіравання і самакіравання па рашэнні некаторых пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва» пачаўся з узнагароджвання найбольш актыўных.

Цікава, што сярод іншых ганаровыя граматы ад старшыні аблсавета дэпутатаў Уладзіміра Цярэнцьева атрымалі старэйшыны вёсак. Чарговы раз ён нагадаў, што менавіта гэтыя людзі дапамагаюць вырашаць актуальныя праблемы землякоў. Яны як звяно паміж уладай і людзьмі.

Віцебшчына — лідар сярод абласцей па колькасці населеных пунктаў — больш чым 6,2 тысячы, амаль у палове вёсак жывуць ад пяці да дзесяці чалавек...

На семінары прагучала і тэма падрыхтоўкі да знамянальных свят. У прыватнасці, у лютым — 30-гадовы юбілей вываду савецкіх войскаў з Афганістана. Таму трэба, каб кожны з тых, хто выконваў інтэрнацыянальны доўг, адчуў павагу, клопат. І калі трэба, мясцовая ўлада павінна аказаць падтрымку ў лячэнні і іншых пытаннях. Вобласць актыўна рыхтуецца годна адсвяткаваць і 75-гадовы юбілей вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. І канешне, у цэнтры ўвагі павінны быць тыя, каму мы абавязаны Перамогай.

Ішла гаворка і аб тым, што робіцца па папярэджанні гібелі і траўматызму людзей пры ўзнікненні пажараў, іншых надзвычайных сітуацый. А таксама аб мерах, якія прымаюцца праваахоўнікамі сумесна з органамі мясцовага кіравання і самакіравання па прафілактыцы злачынстваў і правапарушэнняў.

Шмат увагі было аддадзена і вельмі актуальнай тэме садзейнічання ў працаўладкаванні тых, хто не заняты ў эканоміцы. На Віцебшчыне каля 11,8 тысячы грамадзян не працуюць, пры гэтым не з'яўляюцца беспрацоўнымі. Старшыня аблсавета нагадаў, што такія цяпер павінны поўнасцю аплачваць некаторыя камунальныя паслугі. Але, каб не было памылак, трэба вельмі ўважліва пераправерыць адпаведныя спісы. У некаторых раёнах гэта праца завершана. Але ёсць рэгіёны, дзе яшчэ мясцовая ўлада не валодае поўнай інфармацыяй. І трэба ўважліва вывучыць кожны выпадак індывідуальна, давесці да ведама людзей патрабаванні Дэкрэта № 3. Адказныя асобы павінны зрабіць усё магчымае, каб людзі маглі знайсці сабе занятак, плаціць падаткі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПРАБЛЕМЫ І РАШЭННІ

Адходы ператварыць у даходы

Як на Міншчыне працуюць з другаснай сыравінай

У Мінскай вобласці ў цэлым выкананы планы мерапрыемстваў па навядзенні парадку на зямлі ў адпаведнасці з рэспубліканскай праграмай. Пра гэта паведаміў кіраўнік цэнтральнага рэгіёна Анатоль ІСАЧАНКА на пасяджэнні Мінаблвыканкама. Разам з тым на Міншчыне выклікае заклапочанасць стан палігонаў цвёрдых камунальных ад'ходаў. Летась падчас кантрольных праверак практычна на ўсіх выяўлены недахопы. Хаця гэтае пытанне аблвыканкам разглядаў неаднаразова і звяртаў увагу старшынь райвыканкамаў, іншых службаў на недапушчальнасць такога становішча.

Усяго на Міншчыне эксплуатуецца 34 палігоны і 37 міні-палігонаў Летась працягваліся работы па аптымізацыі аб'ектаў захавання адходаў у сельскай мясцовасці і вывадзе з эксплуатацыі міні-палігонаў, якія не адпавядаюць патрабаванням заканадаўства. Трынаццаць з іх закрытыя, у тым ліку на васьмі прайшла рэкультывацыя. Сёлета плануецца рэкультывацыя яшчэ васьмінаццаці. Як адзначыў **старшыня Мінскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандр БАРАНАЎ,** найбольш частыя парушэнні эксплуатацыі аб'ектаў захавання цвёрдых камунальных адходаў — адсутнасць паслойнага ўшчыльнення або ізаляванага слоя, агароджы, нездавальняючыя пад'язныя шляхі.

Яшчэ адна праблема для цэнтральнага рэгіёна — недастатковы аб'ём вымання з цвёрдых камунальных адходаў другасных матэрыяльных рэсурсаў. Летась гэты паказчык склаў 14 %, у той час як па краіне — 18 %. Цалкам загрузіць магутнасці ліній сартавання ўдалося толькі ў Любанскім, Мінскім раёнах і ў горадзе Жодзіна. Разам з тым ступень загрузкі канвеераў на палігоне ў Барысаве складае 38 %, у Смалявіцкім раёне — 49 % пры значна большых магчымасцях.

Не менш актуальныя для Міншчыны і пытанні эксплуатацыі ачышчальных збудаванняў. Аб'ём выкідаў недастаткова ачышчаных сцёкавых вод — каля 3 мільёнаў кубічных метраў штогод, або 69 % ад агульнага аб'ёму па краіне. У Фаніпалі гэты паказчык на ўзроўні 42 % ад абласнога, у Любані — 30 %. Большасць ачышчальных збудаванняў працуюць 30—45 гадоў і даўно вычарпалі свой рэсурс. У той жа час рэгіён развіваецца, а сталіца будзе будаваць на тэрыторыі вобласці гаражы-спадарожнікі. І з цягам часу праблема можа стаць яшчэ больш вострай.

Акрамя таго, у Мінскай вобласці налічваецца 593 нядзеючыя артэзіянскія свідравіны, на якіх павінен быць праведзены тампанаж. Патрабуюць карэкціроўкі праекты водаахоўных зон, прыбярэжных палос, якія павінны быць прыведзены ў адпаведнасць з Водным кодэксам Рэспублікі Беларусь да 31 снежня 2020 года. Завяршылі распрацоўку праектаў толькі ў Слуцкім і Уздзенскім раёнах. У 2019-м на выкананне гэтых работ прадугледжана 580 тысяч рублёў для раёнаў, якія яшчэ не распачалі гэтую справу.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

САДЗЕЙНІЧАННЕ ЗАНЯТАСЦІ

РАЗГУБІЛІСЯ НА ЖЫЦЦЁВАЙ ДАРОЗЕ?

або Шанц на працаўладкаванне павінен быць у кожнага

Валожынская раённая газета «Працоўная слава» працягвае сачыць за сітуацыяй з працаўладкаваннем беспрацоўных грамадзян у раёне. На мінулым тыдні нашы калегі пабывалі на чарговым пасяджэнні пастаяннай камісіі па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці насельніцтва ў рамках рэалізацыі нормаў дэкрэта аб садзейнічанні занятасці насельніцтва, што створана ў раёне.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

У ім удзельнічалі кіраўнікі і прадстаўнікі розных службаў. Былі разгледжаны пратаколы, дзе адлюстравана работа з грамадзянамі па пацвярджэнні іх занятасці ў квартале, які папярэднічаў фарміраванню базы даных. Справа ў тым, што тыя, хто фігуруе ў спісах людзей, не занятых у эканоміцы, і з'яўляецца ўласнікам жылля, з 1 студзеня павінны стапрацэнтна аплачваць кошт камунальных паслуг: гарачае водазабеспячэнне, цеплазабеспячэнне, газазабеспячэнне (пры наяўнасці індывідуальных газавых ацяпляльных прыбораў), што адпавядае поўнаму пакрыццю расходаў дзяржавы на іх аказанне. Перш чым прымаць рашэнне адносна асобных грамадзян, члены камісіі дэталёва разгледзелі ўсе абставіны і выключылі са спіса тых, хто меў на гэта важкія падставы.

Як адзначыў **старшыня камісіі Пётр БІБІК,** жыхары раёна актыўна звярталіся ў камісію з дакументамі пацвярджэннямі занятасці. У першую чаргу тыя, хто працуе ці вучыцца за мяжой ці мае прысядзібны ўчастак, а таксама шматдзетныя бацькі і бацькі дзяцей, якім не споўнілася сем гадоў. У зборы інфармацыі прынялі ўдзел розныя службы. Вялікую работу ў гэтым кірунку правялі старшыні і спецыялісты сельвыканкамаў. І не дзіўна: у сельскай мясцовасці кожны чалавек на віду. Таму даведацца, чаму некаторыя нідзе не працуюць, лёгка. Многія вяскоўцы апрацоўваюць зямлю, займаюцца рамесніцтвам ці аказваюць агратурыстычныя паслугі.

Першапачаткова ў базе фігуравалі каля 2 тысяч грамадзян. У выніку праведзенай работы 1005 чалавек прызнаны занятымі ў эканоміцы. Адносна тых, хто па-ранейшаму застаецца ў спісе, работа працягваецца. На пасяджэнне, напрыклад, запрасілі чатырох жыхароў райцэнтра (патэнцыйных плацельшчыкаў), якія на працягу многіх гадоў не могуць знайсці сябе ў прафесійным плане. Прычыны такога становішча часцей за ўсё банальныя: злоўжыванне алкаголем, неаднаразовае адбыванне пакарання за тое ці іншае злачынства, лячэнне ў ЛПП. **Сакратар камісіі Марына ІОДА** заўважыла: «Нягледзячы на тое што гэтыя людзі разгубіліся на жыццёвай дарозе, мы абавязаны даць ім яшчэ адзін шанц і дапамагчы замацавацца ў адной з арганізацый, дзе ёсць вакансіі».

Напрыклад, 57-гадоваму мужчыну далі накіраванне ў РУП «Валожынскі жылкамунгас». Ён, дарэчы, ужо шмат гадоў перабіваецца часовымі заробкамі. Пасля таго як яму растлумачылі сітуацыю з аплатай камунальных паслуг, выказаў гатоўнасць афіцыйна працаўладкавацца. На жаль, далёка не кожны з тых, каму неаднойчы спрабавалі дапамагчы, цэніць гэты клопат. Іх незадаволенасць любой з прапанаваных работ наводзіць на думку пра тое, што ёсць сярод нас сапраўдныя тунеядцы. Што ж, магчыма, сумы за камуналку прымусяць задумацца...

ПРАЕКТ

«ГОРКА!» АМАЛЬ ПРАЗ СТАГОДДЗЕ

У Клецку плануюць узнавіць старадаўнія вясельныя строі

У сістэме клубных устаноў культуры Мінскай вобласці 2019-ы абвешчаны годам вясельнай абраднасці. Таму ва ўсіх кутках цэнтральнага рэгіёна ў хуткім часе будуць арганізаваны даследчыя экспедыцыі па вывучэнні вясельных традыцый, выстаўкі старых вясельных фатаграфій і дзіцячых малюнкаў, перасоўныя выстаўкі вясельных убораў, раённыя агляды-конкурсы этнаграфічных калекцый.

Клецкія культработнікі плануюць рэалізаваць амбіцыйны праект па гістарычнай рэканструкцыі адзення маладых з гэтай мясцовасці на падставе старадаўніх здымкаў, паведамляе раённая газета «Да новых перамог». Аўтары ідэі шукаюць вясельныя фатаграфіі, зробленыя да 1940 года, і просяць падзяліцца копіямі фота па электронным адрасе Klezk_gazeta@tut.by або прынесці арыгіналы ў рэдакцыю раённай газеты. У якасці ўзнагароды для тых, хто адгукнецца на просьбу, арганізатары праекта гарантуюць магчымасць убачыць і дакрануцца да дэталёва адноўленых вясельных строяў сваіх продкаў.

На здымку — адным з прэтэндэнтаў на рэканструкцыю — бацькі Марыі Пілецкай 1929 года нараджэння. Распытаць Марыю Якаўлеўну пра падрабязнасці вясельнага абраду ў журналістаў не атрымалася, бо з гадамі яна амаль страціла слых. Доўгі час жанчына захоўвае гэтае фота, што зроблена прыкладна ў 1927 годзе. Здымак выкананы ў выглядзе паштоўкі: на адваротным баку можна было напісаць адрас і даслаць поштай родным. Можна разгледзець адзенне маладых таго часу і галаўны ўбор нявесты, які складаўся з шапачкі, упрыгожанай кветкамі, а таксама кароткай па даўжыні фаты.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 31 студзеня 2019 года.